Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

28 САКАВІКА 2008 г. ПЯТНІЦА

№ 59 (26172)

Кошт 490 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Прамая лінія

## УСЁ ПРА ДАПАМОГУ З АДРАСАМ

З моманту ўвядзення новых умоў аказання адраснай сацыяльнай дапамогі прайшло больш за тры месяцы. Між тым гэта тэма — па-ранейшаму на слыху. Хто можа і хто не можа разлічваць на адрасную падтрымку, на каго з членаў сям'і яна прызначаецца, як вызначаюцца выплаты, што такое сукупны даход і каэфіцыент уліку эфекту ад сумеснага пражывання? Аб усім гэтым і іншым мы прапануем вам пагутарыць падчас «прамой лініі» з **начальнікам упраўлення дзяржаўнай сацыяльнай падтрымкі насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Валянцінай Пятроўнай СЯРГЕЕВАЙ.**

***Такім чынам, увага! Наша «прамая лінія» будзе праходзіць СЁННЯ з 11 да 12 гадзін па рэдакцыйных тэлефонах (8 017) 292 38 21 і 292 38 92.***



## СА «ЗВЯЗДОЙ» — У ДРУГІМ КВАРТАЛЕ!

***Заканчваецца падпіска на II квартал 2008 года***

**Падпісныя цэны на газету «Звязда» (у рублях)**

| *Індэкс* | *на 1 месяц* | *на 3 месяцы* | *на 6 месяцаў* |
|---|---|---|---|
| **63850 (індывідуальны)** | **8800** | **26400** | **52800** |
| **63145 (індывідуальны льготны для пенсіянераў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны)** | **8300** | **24900** | **49800** |
| **63858 (ведамасны)** | **14000** | **42000** | **84000** |
| **63239 (ведамасны льготны для ўстаноў міністэрстваў культуры, адукацыі і аховы здароўя)** | **12800** | **38400** | **76800** |



## Прэзідэнт Беларусі запатрабаваў нарошчваць тэмп гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва з краінамі Персідскага заліва

**Санкцыі ЗША ў адносінах да Беларусі павінны быць кампенсаваны дыверсіфікацыяй экспарту. Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на нарадзе па пытаннях супрацоўніцтва з краінамі Персідскага заліва.**

«Апошнім часам нашы «свядомыя» ўсё часцей гавораць аб тым, што ў нас будуць праблемы ў эканоміцы, амерыканцы нас прыціснулі, аб гэтым дакладвае і МЗС», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Пры гэтым ён дадаў, што «калі б мы працавалі па іншых напрамках, то не заўважылі б гэтых амерыканскіх санкцый».

«Хіба праблема сёння прадаць калій у іншыя дзяржавы, а гэта асноўны артыкул экспарту ў ЗША, — адзначыў Прэзідэнт. — Аказалася, няма ніякіх праблем. Мы з лёгкасцю можам размясціць свае заказы. Растуць патрэбнасці на калій у свеце — адсюль і завоблачныя цэны на калійныя ўгнаенні. Аказалася, што мы проста можам прадаць гэту прадукцыю, і гэтыя амерыканскія санкцыі нічога не вартыя, яны самі сёння гэта зразумелі і ўсвядомілі».

Як падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, даўно трэба было дыверсіфікаваць беларускі экспарт. «Мы не можам быць завязаны толькі на Расію, Еўрасаюз і ЗША», — дадаў ён.

Прэзідэнт Беларусі незадаволены ўзроўнем рэалізацыі дамоўленасцяў, дасягнутых у ходзе яго замежных візітаў.

«Мяне насцярожвае невыкананне або неналежнае выкананне дамоўленасцяў па выніках замежных візітаў. Вы ведаеце мае патрабаванні: ніякіх турыстычных паездак. Калі ажыццяўляюцца візіты, а тым больш візіты на вышэйшым узроўні, яны павінны прыносіць краіне канкрэтныя вынікі», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

«Калі ажыццяўляюцца візіты на вышэйшым узроўні, то ўсе гавораць, што ўдалося дасягнуць добрых дамоўленасцяў. А дзе вынік? Хачу пераканацца, наколькі ў рэальнасці выконваюцца гэтыя дамоўленасці», — сказаў Прэзідэнт. На яго думку, гэта дасць магчымасць больш эфектыўна «адсочваць наша ўзаемадзеянне з партнёрамі», своечасова выяўляць тармозячыя фактары і выпрацоўваць механізм іх пераадолення.

Як лічыць Аляксандр Лукашэнка, асноўная прычына неналежнага выканання дамоўленасцяў — нежаданне эфектыўна працаваць.

На нарадзе па пытаннях рэалізацыі дамоўленасцяў па выніках візітаў на вышэйшым узроўні ў краіны Персідскага заліва кіраўнік дзяржавы адзначыў, што за апошнія восем гадоў адбыліся візіты на вышэйшым узроўні ў Бахрэйн, Кувейт, Аман і два візіты ў Аб'яднаныя Арабскія Эміраты.

Актыўнасць беларускага боку ў супрацоўніцтве з краінамі Персідскага заліва абумоўлена тым, што гэты параўнальна невялікі рэгіён дынамічна развіваецца, пачынае аказваць усё большы ўплыў не толькі на сусветную эканоміку, але і на міжнародную палітыку, растлумачыў Прэзідэнт. Да таго ж дзяржавы Персідскага заліва маюць найбагацейшы энергетычны патэнцыял. У іх нетрах сканцэнтравана амаль дзве трэці сусветных запасаў нафты і больш як трэць — запасаў прыроднага газу. Тут канцэнтруюцца інвестыцыйныя рэсурсы самых буйных транснацыянальных карпарацый. «Дастаткова толькі глянуць на маштабныя інфраструктурныя праекты, што рэалізуюцца ў ААЭ, Катары і іншых краінах», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт адзначыў высокі ўзровень палітычных сувязяў Беларусі з гэтымі дзяржавамі, устаноўленых у час сустрэч і даверных кантактаў з членамі кіруючых сем'яў рэгіёна. «Асабістыя кантакты на Усходзе маюць ключавое значэнне для паспяховага супрацоўніцтва. Гэтым мы і кіраваліся, мэтанакіравана выбудоўваючы ўзаемаадносіны з гэтымі дзяржавамі», — падкрэсліў ён.

***(Заканчэнне на 2-й стар.)***

# «Усе вучаць жыць...»



***Самая маленькая жыхарка вёскі Ніжні Церабяжоў Маша БАЖКО з бабуляй Ірынай ЧАРНАМАЗАВАЙ і суседскімі бабулямі.*** *Столінскі раён.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Камандзіроўка па пісьму

# КАВАЛАК ЗЯМЛІ, або Цяжкасці і крыўды ўпарадкавання

### ЛІСТ

У рэдакцыю прыйшло пісьмо ад Андрэя Піліпавіча Цебука з вёскі Пешкава Іванаўскага раёна. Ён піша: «Больш за дзесяць гадоў таму я звярнуўся да старшыні калгаса «Светлы шлях» Васілеўскага (цяпер ужо нябожчыка) з просьбай дазволіць выкарыстоўваць невялікі ўчастак зямлі, што побач з рэчкай Струга. Гэта зямля ніколі не апрацоўвалася і была зарослая хмызняком і асакой. Васілеўскі дазволіў апрацоўваць участак. Сказаў, што раскарчоўваць яго калгасу няма ніякага сэнсу. Нямала я патраціў сілы, здароўя, сродкаў, каб упарадкаваць гэту зямлю. Не адну тону ўгнаення ўносіў штогод. Нельга сказаць, што названы надзел мяне абагаціў, але ж падтрымку для вядзення сваёй гаспадаркі я меў. Увесь гэты час ніхто не выказваў ніякіх прэтэнзій за гэту зямлю. Але ў канцы мінулага года я атрымаў рашэнне Іванаўскага райвыканкама «О возврате самовольно занятого участка земли», а потым і павестку ў суд. У судзе вывучылі справу і прынялі рашэнне: «Цебука А. П. ад адміністрацыйнай адказнасці вызваліць». Думаў, пытанне вырашана. Аказалася, не. У снежні мінулага года з раённай падатковай інспекцыі атрымліваю паведамленне, што павінен заплаціць больш за мільён рублёў падатку за «самавольна занятую зямлю».

Не разумею, чаму мяне ні разу не папярэдзілі, што я незаконна выкарыстоўваю зямлю. Чаму нікому няма справы да таго, што ў ваколіцах не апрацоўваюцца дзесяткі гектараў зямлі ААТ «Баравіца» (былы калгас «Светлы шлях»)? І адкуль такая «ўвага» да мяне, пенсіянера?»

***(Заканчэнне на 6-й стар.)***

### Грамадская арганізацыя «Сялянка» створана ў Беларусі

**Створана грамадская арганізацыя вясковых жанчын «Сялянка». Рашэнне прынята на ўстаноўчай канферэнцыі аб'яднання вясковых жанчын Беларусі.**

Першы намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Надзея Каткавец, падкрэсліла, што стварэнне пярвічнай арганізацыі «Сялянка» дазволіць вясковым жанчынам рэалізаваць свежыя ідэі. Арганізацыя ставіць перад сабой задачу вырашаць сацыяльныя і бытавыя праблемы на вёсцы, падтрымліваць жанчын у арганізацыі бізнэсу, стварэнні жаночых кааператываў. Арганізацыя вясковых жанчын «Сялянка» стане адным са структурных падраздзяленняў Беларускага саюза жанчын.

**Таццяна ЛОБАС, БЕЛТА.**

### Да ведама дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь

Восьмая сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання пачне сваю работу 2 красавіка 2008 года ў 10 гадзін у зале пасяджэнняў Палаты прадстаўнікоў (Дом Ураду, Авальная зала).

Рэгістрацыя дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў будзе праводзіцца 2 красавіка 2008 года з 8.30 да 9.50 у фае залы пасяджэнняў.

Футбол

# ПАЎГЕРОІ...

**Таварыскім матчам «Беларусь — Турцыя» распачаўся хатні футбольны сезон для нацыянальнай зборнай. Вынік сустрэчы адпавядае яе статусу — нічыя 2:2.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Прыезд зборнай Турцыі — падзея ў спартыўным жыцці сталіцы і яе наваколля неардынарная — сабраў на стадыёне «Дынама» каля 10 тысяч гледачоў. Каманда з гарачых турэцкіх берагоў, натхнёная расказамі пра беларускую сталіцу і прыгажосцю беларусак, нягледзячы на тое, што гульня таварыская, прыбыла ў больш чым поўным складзе — 30 футбалістаў і столькі ж журналістаў, плюс трэнеры і персанал. Зборная Беларусі прадстала без кадравых празмернасцяў, у складзе 22 футбалістаў.

***(Заканчэнне на 2-й стар.)***

РОЗГАЛАС — АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### ДАЧАКАЛІСЯ ВЯСНЫ, У АЎТОРАК ПРЫГРЭЕ ДА ПЛЮС 16

**У гэтыя выхадныя тэрыторыя нашай краіны трапіць у зону павышанага ціску, таму ападкаў не прадбачыцца, — паведаміў рэдакцыі начальнік службы гідраметэапрагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Дзмітрый Рабаў.**

У суботу-нядзелю толькі месцамі па паўночным захадзе магчымыя невялікія дажджы. У гэтыя дні месцамі туман, уначы і раніцай на асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы ад мінус 4 да плюс 3 градусаў, па ўсходзе — да 7 марозу; удзень — 6—13 цяпла.

У пачатку наступнага тыдня будзе сонечна і тэмпература паветра павысіцца. У панядзелак тэмпература паветра ўначы ад 4 градусаў марозу да 3 цяпла, удзень — плюс 8—15 градусаў. У першы дзень красавіка ўначы ад мінус 1 да плюс 5 градусаў, удзень — 10—16 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

### ІЛЖЭІНСПЕКТАРЫ СКРАЛІ ЛОДКУ

**На бераг ракі Шчары паблізу вёскі Малая Воля Дзятлаўскага раёна на аўтамабілі пад'ехалі тры невядомыя асобы. Якраз тут ляжалі лодкі.**

Яны падазвалі да сябе грамадзяніна, які пражываў побач, і, назваўшыся работнікамі Дзяржінспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету, адсеклі ланцуг на адным з плавальных сродкаў і звезлі яго. Маўляў, на лодцы адсутнічалі рэгістрацыйныя знакі, патлумачылі «інспектары». Пацярпелы звярнуўся ў міліцыю, якая ўстанавіла, што гэта былі раней судзімы жыхар сталіцы і два жыхары гарпасёлка Казлоўшчына Дзятлаўскага раёна. Праводзіцца разбор. А Дзяржінспекцыя папярэджвае, што ў дзяржінспектараў абавязкова павінна быць пасведчанне асобы і нагрудны знак з асабістым нумарам. Калі яны адсутнічаюць, трэба адразу звяртацца ў міліцыю, бліжэйшую міжраённую ці абласную інспекцыю, або на «гарачую лінію» Дзяржінспекцыі па нумары 8 017 289 39 55.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

### ДАБРАЧЫННЫ АЎКЦЫЁН

**адбудзецца 29 сакавіка ў 15 гадзін у Палацы мастацтваў у рамках выстаўкі «Сакавіцкія каты».**

На дабрачынным аўкцыёне будуць прадстаўлены жывапісныя, графічныя і скульптурныя творы вядомых беларускіх мастакоў. Усе сродкі пойдуць на лячэнне студэнткі 3-га курса Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтва Галіны Жыжыч. Пасля аўтакатастрофы дзяўчына мае патрэбу ў некалькіх аперацыях.

**Наш кар.**

### СЕРЫЮ МАНЕТ ПАПОЎНІЛА «ЗЯЗЮЛЯ»

**Нацыянальны банк Беларусі выпусціў у абарачэнне памятныя манеты «Легенда пра зязюлю» серыі «Беларускія народныя легенды».**

Сярэбраная манета мае намінал 20 рублёў, пробу сплаву 925 і масу 33,62 грама, медна-нікелевая выпушчана наміналам 1 рубель, масай 15,50 грама. Як адзначылі ва ўпраўленні інфармацыі Нацбанка, выраблены гэтыя манеты на ЗАТ «Літоўскі манетны двор»: сярэбраныя — якасцю «пруф», медна-нікелевыя — «пруф-лайк». Тыраж абедзвюх манет па 5000 штук.




**Ігар ГРЫШЫН.**



## ГОДОВОЙ БАЛАНС ЗАСО «ПРОМТРАНСИНВЕСТ» ЗА 2007 ГОД

СТРАХОВАЯ КОМПАНИЯ ПРОМТРАНСИНВЕСТ

УСПЕШНОЙ РАБОТЫ 15 ЛЕТ НА СТРАХОВОМ РЫНКЕ

**220039 г. Минск, ул. Воронянского, 7А. Тел. (017) 222 75 49**

млн.руб.

| АКТИВ | | ПАССИВ | |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **Основные средства** | **6 039** | **Источники собственных средств всего** | **7 551** |
| **Нематериальные активы** | **12** | в том числе: | |
| **Финансовые вложения, всего** | **70** | уставный фонд | 3 788 |
| в том числе: | | резервный фонд | 248 |
| инвестиции в дочерние общества | — | добавочный фонд | 3 107 |
| инвестиции в другие организации | — | фонд накопления | — |
| облигации и другие долговые обязательства | 70 | фонд потребления | — |
| прочие финансовые вложения | — | целевое финансирование | — |
| **Доля перестраховщиков в страховых резервах** | **4 272** | нераспределенная прибыль прошлых лет | — |
| **Дебиторы, всего** | **1 544** | нераспределенная прибыль отчетного года | 408 |
| в том числе: дебиторская задолженность по операциям страхования, сострахования и перестрахования | 267 | **Страховые резервы и фонды, всего** | **16 744** |
| депо премий по рискам, принятым в перестрахование | — | в том числе: страховые резервы | 16 205 |
| дебиторская задолженность (кроме операций страхования, сострахования и перестрахования) | 1 277 | фонд предупредительных (превентивных) мероприятий | 515 |
| **Прочие активы, всего** | **14 894** | гарантийные фонды | 24 |
| в том числе: незавершенное строительство | 325 | **Кредиторы, всего** | **1 735** |
| материальные ценности и затраты | 452 | в том числе: кредиторская задолженность по операциям страхования, сострахования | 196 |
| денежные средства | 14 114 | кредиторская задолженность по операциям перестрахования | — |
| собственные акции (доли) | — | депо премий по рискам, переданным в перестрахование | — |
| прочие активы | 3 | заемные средства | 735 |
| **Непокрытые убытки прошлых лет** | — | кредиторская задолженность (кроме операций страхования, сострахования и перестрахования) | 804 |
| **Непокрытые убытки отчетного года** | — | **Прочие пассивы** | **801** |
| **БАЛАНС** | **26 831** | **БАЛАНС** | **26 831** |

## ОТЧЕТ О ФИНАНСОВЫХ РЕЗУЛЬТАТАХ ЗАСО «ПРОМТРАНСИНВЕСТ» ЗА 2007 ГОД

млн.руб

| НАИМЕНОВАНИЕ ПОКАЗАТЕЛЯ | Код строки | За отчетный период |
|---|---|---|
| **1. Страхование жизни** | | |
| Страховые взносы (премии) | 010 | — |
| Страховые выплаты | 020 | — |
| Изменение резерва по страхованию жизни (+ или -) | 030 | — |
| Отчисления в гарантийный фонд | 040 | — |
| Расходы на ведение дела | 041 | — |
| **Результат от операций по страхованию жизни (+ или -)** | 050 | — |
| **2. Страхование иное, чем страхование жизни** | | |
| Страховые взносы (премии) — нетто перестрахование | 064 | 30 546 |
| Изменение резерва незаработанной премии — нетто перестрахование (+ или -) | 067 | -1 920 |
| Оплаченные убытки (страховые выплаты) — нетто перестрахование | 082 | 14 497 |
| Изменение резервов убытков — нетто перестрахование (+ или -) | 092 | -2 000 |
| Изменение других технических резервов (+ или -) | 100 | — |
| Изменение иных страховых резервов (+ или -) | 105 | — |
| Отчисления в фонд предупредительных (превентивных) мероприятий и гарантийные фонды | 110 | 1 807 |
| Расходы на ведение дела | 120 | 10 259 |
| Комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, переданным в перестрахование | 121 | 395 |
| Комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, принятым в перестрахование | 122 | 58 |
| **Результат от операций по видам страхования иным, чем страхование жизни (+ или -)** | 130 | 400 |
| **3. Прочие доходы и расходы, не отнесенные в разделы 1 и 2** | | |
| Операционные доходы | 140 | 6 020 |
| Операционные расходы | 145 | 4 393 |
| Внереализационные доходы | 150 | 869 |
| Внереализационные расходы | 155 | 173 |
| Финансовый результат | 157 | 2 723 |
| Использовано прибыли | 158 | 2 315 |
| Нераспределенная прибыль (убытки) отчетного периода (+ или -) | 170 | 408 |

В 2007 году компания сотрудничала с аудитором индивидуальным предпринимателем Ткач Светланой Ивановной. Юридический адрес: 220022, г. Минск, ул. Чайлытко, д. 20, кв. 64. Специальное разрешение (лицензия) на право осуществления аудиторской деятельности № 02200/0060292 от 03.02.2004 г. выдана Министерством финансов Республики Беларусь со сроком действия по 02.02.2009 г. УНП 100990426. Свидетельство о государственной регистрации от 24.08.2000 г. № 955 выдано Минским горисполкомом.

Аудиторское заключение: бухгалтерская (финансовая) отчетность ЗАСО «Промтрансинвест» достоверна, т.е. подготовлена таким образом, чтобы обеспечить во всех существенных аспектах отражение активов и пассивов ЗАСО «Промтрансинвест» на 1 января 2008 года и финансовых результатов его деятельности за 2007 год.

УНП 100357923

## Колодищанский сельский исполнительный комитет Минского района (Продавец) совместно с КУП «Минский областной центр учета недвижимости» проводят открытый аукцион

**по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов в Минском районе:**

| № лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь земельного участка | Наличие инженерных сетей | Начальная цена (бел. рублей) |
|---|---|---|---|---|
| 1 | п. Колодищи, ул. Поселковая; 623683403101005700 | 0,2041 га | водопровод, газ, электричество | 74 000 000 |
| 2 | п. Колодищи, ул. Поселковая; 623683403101005701 | 0,1579 га | водопровод, газ, электричество | 57 000 000 |
| 3 | п. Колодищи, ул. Борисовская; 623683403101005699 | 0,0552 га | водопровод, газ, канализация, электричество | 24 000 000 |
| 4 | д. Старина, ул. Ленина; 623683404101000218 | 0,1539 га | водопровод, электричество, (разрабатывается проект газоснабжения) | 17 000 000 |
| 5 | д. Старина, ул. Ленина; 623683404101000219 | 0,1390 га | водопровод, электричество, (разрабатывается проект газоснабжения) | 15 000 000 |

Залог в размере 5 % от начальной цены земельного участка и специальный сбор за участие в аукционе в размере 4 базовых величин перечисляются на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», г. Минск, МФО 153001357, УНП 690324015, КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Оплата за земельный участок должна быть осуществлена в течение 30 календарных дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. **Аукцион состоится 29 апреля 2008 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 28 апреля 2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

**Контактный телефон (8 017) 224 61 34. Наш сайт в Интернете: www.rlt.by.**

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015

**КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»**

## ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже 3-этажного кирпичного здания (общ. пл. 2038 кв.м, пл. зем. уч. 0,3611 га) и здания проходной (общ. пл. 10 кв.м, пл. зем. уч. 0,0049 га), расположенных: Смолевичский р-н, д. Будагово. Начальная цена снижена на 50 % и составляет 390 000 000 бел. руб с НДС. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 08.12.2007 г. Аукцион состоится 08.04.2008 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 07.04.2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

***Контактный телефон (8017) 224 61 34***
***Сайт в Интернете: www.rlt.by***

*КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.*

**КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»**

## ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже здания ателье № 5, об. пл. 155,0 кв.м, расположенное: г. Слуцк, ул. Жукова, д. 21. Площадь зем. участка 0,0595 га. Начальная цена с НДС — 80000000 бел. рублей. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 22.02.2008 г. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится 22.04.2008 г. в 15.00 по адресу: г. Слуцк, ул. Уласовца, 3. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 21.04.2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

***Контактный телефон (8017) 224 61 34***
***Сайт в Интернете: www.rlt.by.***

*КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.*



ISSN 1990 - 763X

**КУРСЫ ВАЛЮТ**

***Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 28.03.2008 г. (для б/н разлікаў)***

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 145,00 |
| 1 еўра | 3 380,73 |
| 1 латвійскі лат | 4 852,39 |
| 1 літоўскі літ | 979,12 |
| 1 чэшская крона | 133,39 |
| 1 польскі злоты | 959,24 |
| 1 расійскі рубель | 91,21 |
| 1 украінская грыўня | 428,27 |

***Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў***

**Цэнтрабанк РФ**

| | |
|---|---|
| USD | 23,5171 |
| 10 UAH | 46,6082 |
| 1000 BYR | 10,9477 |
| EUR | 37,0794 |

***Курс у гандлёвых кампаніях (на 27.03.2008 г.)***

USD ............ 2135 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

*Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

*ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009*

# Прэзідэнт Беларусі запатрабаваў нарошчваць тэмп гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва з краінамі Персідскага заліва

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, было дасягнута шмат дамоўленасцяў, у тым ліку аб наведванні Беларусі членамі сем'яў, наследнымі прынцамі гэтых дзяржаў. «Да чаго гэта можа прывесці, вы ведаеце — гэта інвестыцыі, вялікія ўкладанні ў эканоміку Беларусі, — заўважыў ён. — Чаму да гэтага часу не рэалізаваны гэтыя дамоўленасці?»

Усе гэтыя гады Беларусь актыўна стварала дагаворна-прававую базу двухбаковых адносінаў з дзяржавамі Персідскага заліва. Падпісана больш як 50 міжнародных дагавораў і падрыхтавана каля 25 праектаў пагадненняў. З кожнай дзяржавай заключаны пакет юрыдычных дакументаў, якія даюць магчымасць развіваць усебаковае супрацоўніцтва. З 1999 года ў ААЭ працуе пасол Рэспублікі Беларусь, па сумяшчальніцтву акрэдытаваны ў шэрагу іншых краін рэгіёна. Дыпламатычнае прадстаўніцтва ў ААЭ — адно з найбольш буйных у рэгіёне Азіі, Афрыкі і Блізкага Усходу, канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

«Нягледзячы на гэта, нельга сказаць, што Беларусь у адносінах з краінамі Персідскага заліва дасягнула значных вынікаў, — лічыць Прэзідэнт. — Цяпер асноўным артыкулам нашага экспарту ў гэтыя дзяржавы застаюцца тавары ваеннага або двайнога прызначэння. А дзе вынікі работы беларускіх дыпламатаў па прасоўванні нашай грамадзянскай прадукцыі ў рэгіёне? Супрацоўніцтва ў крэдытна-інвестыцыйнай сферы таксама вымушае жадаць лепшага. Гэта датычыцца і Кувейцкага фонду арабскага эканамічнага развіцця. Дзе іншыя абяцаныя інвестыцыйныя праекты?»

Урад рапартуе аб паспяховай рэалізацыі дамоўленасцяў, аднак пры больш глыбокім вывучэнні карціна выглядае не так адназначна, сказаў Аляксандр Лукашэнка, адзначыўшы, што звычайнай практыкай стаў перанос з году ў год тэрмінаў выканання даручэнняў Прэзідэнта. «Заканамернае пытанне, наколькі былі прапрацаваны адпаведныя прапановы да ўнясення Прэзідэнту», — дадаў ён.

Прэзідэнт падкрэсліў, што неабходна дасканала прааналізаваць характар адносінаў Беларусі з дзяржавамі Персідскага заліва, высветліць, чаму ўстаноўленыя на вышэйшым узроўні кантакты не выкарыстоўваюцца эфектыўна, што перашкаджае нарошчванню экспарту ў гэтыя краіны і прыцягненню адтуль інвестыцый, — і прыняць рэальныя меры па нарошчванні тэмпаў гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва з краінамі гэтага рэгіёна.

**Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.**

# Сярэдняя зарплата работнікаў Беларусі ў лютым склала $354,4, у бюджэтнай сферы — $300,3

**У Беларусі намінальная налічаная сярэднямесячная заработная плата работнікаў у студзені-лютым гэтага года склала Br758,7 тыс.**

Яна павялічылася да ўзроўню аналагічнага перыяду 2007 года на 22,5 працэнта (па прагнозу на 2008 год — на 18,8 працэнта), паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў галоўным упраўленні працы і заработнай платы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны.

Сярэдняя лютаўская зарплата ў Беларусі склала Br761,6 тыс. ($354,4 у эквіваленце).

У лютым узровень сярэдняй заработнай платы ў работнікаў прамысловасці быў роўны $409,8; будаўніцтва — $443,4; транспарту — $403,7; сувязі — $393,8; сельскай гаспадаркі — $204,2 у эквіваленце.

Лютаўская зарплата ўрачоў была ў сярэднім $486,9; настаўнікаў — $321,7; прафесарска-выкладчыцкага складу — $576,6; навуковых работнікаў — $475,7; артыстаў — $336,7 у эквіваленце.

# Юшчанка расказаў пра даходы

**Агульная сума сукупнага даходу прэзідэнта Украіны Віктара Юшчанкі ў 2007 годзе склала 926 тыс. 922,16 грыўняў (афіцыйны курс Нацбанка — 5,05 грн./$1), паведаміла ў чацвер прэс-служба кіраўніка дзяржавы. Зарплата В. Юшчанкі ў 2007 годзе дасягнула амаль 482 тыс. грн.**

Выкладчыцкая дзейнасць прынесла яму даход 172,2 тыс. грн., дывідэнды, працэнты — 272,7 тыс. Плошча зямельных участкаў, якімі валодае В. Юшчанка, склала 131 385 квадратных метраў. Дом у прэзідэнта плошчай 656,7 кв. м, кватэра — 371,9 кв. м.

За яго сям'ёй лічыцца таксама кватэра плошчай 371,9 кв. м. Пры гэтым у прыватнай уласнасці ні ў прэзідэнта, ні ў яго сям'і, згодна з данымі дэкларацыі, няма транспартных сродкаў.

Сума грашовых сродкаў В. Юшчанкі на рахунках банкаў і іншых фінансава-крэдытных устаноў склала 2 млн 123 тыс. 26,25 грн. У 2006 годзе даходы прэзідэнта Украіны склалі 1,141 млн грн.

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### 3-ЗА САМІТУ НАТА РУМЫНАМ ЗАБАРАНІЛІ ЖАРТАВАЦЬ ПЕРШАГА КРАСАВІКА

**Румынскі міністр замежных спраў Адрыян Чыярану засцярог жыхароў краіны ад першакрасавіцкіх жартаў напярэдадні саміту НАТА, які пройдзе ў гэтай краіне з другога па чацвёртага красавіка.**

Міністр падкрэсліў, пакаранне для тых, хто няўдала пажартуе падчас такога важнага мерапрыемства, будзе асабліва жорсткім. У першыя дні красавіка ў Бухарэсце сустрэнуцца кіраўнікі больш за 50 дзяржаў, у тым ліку, і прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін. У парадак дня саміту ўваходзіць, у прыватнасці, абмеркаванне праблемы незалежнасці Косава і пытанняў аб размяшчэнні амерыканскай сістэмы ПРА ў Польшчы. Раней меркавалася, што ў Бухарэсце будзе абмяркоўвацца і пытанне аб уступленні Украіны і Грузіі ў НАТА, аднак спецпрадстаўнік генеральнага сакратара НАТА Роберт Сіманс заявіў, што гэтую праблему краіны — удзельніцы альянсу разглядаць не будуць.

### ПОЛЬСКІ ПРЭМ'ЕР АБ'ЯВІЎ АБ БАЙКОЦЕ ЦЫРЫМОНІІ АДКРЫЦЦЯ АЛІМПІЯДЫ-2008

**Прэм'ер-міністр Польшчы Дональд Туск аб'явіў аб тым, што ён не прыедзе на цырымонію адкрыцця летняй Алімпіяды 2008 года ў Пекіне.**

Рашэнне Туска звязана з нядаўнімі падзеямі ў Тыбеце. Польскі прэм'ер лічыць, што цырымонію адкрыцця Алімпійскіх гульняў павінны байкатаваць кіраўнікі ўсіх краін, піша Warsaw Business Journal.

### АЎСТРЫЙСКІ МІЛЬЯРДЭР АБАГНАЎ АБРАМОВІЧА ПА КОШЦЕ РАЗВОДУ

**Аўстрыйскі мільярдэр Марцін Шлаф заплаціў сваёй былой жонцы пры разводзе 200 мільёнаў еўра, «пабіўшы рэкорд» расійскага алігарха Рамана Абрамовіча.**

«Венскі прадпрымальнік, багацце якога ацэньваецца ў 1,6 мільярда еўра, дазволіў сабе без лішняга шуму самы дарагі развод у свеце», — паведаміла газета Heute. Расстаўшыся са сваёй жонкай, аўстрыец заплаціў ёй на 10 мільёнаў еўра больш, чым Абрамовіч сваёй, якая атрымала ад яго «ўсяго» 190 мільёнаў еўра, адзначае выданне.

## На выплату надбавак на сельгаспрадукцыю, што закупляецца ў насельніцтва, выдзелена Br47,92 млрд

**Такое рашэнне змяшчаецца ў пастанове Савета Міністраў Беларусі № 441 ад 22 сакавіка гэтага года.**

Пры гэтым будзе захаваны парадак выплаты да закупачных цэнаў на сельгаспрадукцыю, якi дзейнічаў у 2007 годзе, на закупляемы ў насельніцтва маладняк буйной рагатай жывёлы жывой вагой 100 кг, а таксама на бульбу для прамысловай перапрацоўкі. Надбаўкі да закупачных цэнаў на маладняк буйной рагатай жывёлы ад 100 кг і менш у памеры Br1 тыс. за 1 кг будуць стымуляваць яго рэалізацыю насельніцтвам для дагадоўвання ў сельскіх гаспадарках. Устаноўленне надбавак на бульбу для прамысловай перапрацоўкі ў памеры Br150 за 1 кг дасць магчымасць закупіць яе ў неабходных аб'ёмах.

У 2008 годзе прапануецца значна павысіць матэрыяльную зацікаўленасць уладальнікаў асабістых падворкаў у здачы малака дзяржаве. Прадугледжаны выплаты насельніцтву за ўтрыманне адной каровы пры ўмове, калі ўладальнікі асабістых падворкаў будуць здаваць малако для перапрацоўкі малакаперапрацоўчым арганізацыям, прадпрыемствам спажывецкай кааперацыі і арганізацыям, якія ажыццяўляюць вытворчасць сельскагаспадарчай прадукцыі, ад Br30 тыс. да Br230 тыс. У прыватнасці, за рэалізацыю малака базіснай тлустасці ад 1 каровы ад 500 кг да 999 кг прадугледжана выплата ў памеры Br30 тыс., ад 1000 кг да 1499 кг — Br68 тыс, ад 1500 кг да 1999 кг — Br120 тыс., ад 2000 кг да 2499 кг — Br180 тыс., ад 2500 кг і вышэй — Br230 тыс.

**БЕЛТА.**

# ПАЎГЕРОІ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Сабраць «каманду мары» Бернду Штанге на гэты раз не ўдалося. Пасля матча галоўны трэнер шкадаваў, што не было паўабаронцы «з міжнародным вопытам» Аляксандра Кульчыя, якога клубнае кіраўніцтва «Растова» папрасіла на гэты раз у зборную не выклікаць. Траўмаваны Цімафей Калачоў, хоць і прыехаў у Мінск, але не выйшаў на поле. Віталь Кутузаў і Павел Пласконны, у якіх аналагічныя праблемы, былі задзейнічаны не на ўвесь гульнявы час. Віталь Кутузаў, тым не менш, удала выканаў сваю бамбардзірскую функцыю, адкрыўшы лік на 35-й хвіліне гульні прыгожым ударам, і роўна на чатыры хвіліны заняўшы турэцкіх журналістаў, якія прыняліся развучваць у ложы прэсы прозвішча беларускага нападаючага «Ку-ту-заф». А на 39-й хвіліне іх увагу ад гэтага прыемнага занятку адцягнуў гол у адказ Тунджая Санлі.

Падзеі ў другім тайме развіваліся па аналагічным сцэнарыі — на 69-й хвіліне вызначыўся Вячаслаў Глеб, праз шэсць хвілін беларусам адказаў Цюмер Мецін. Не рэалізаваўшы стопрацэнтны момант пасля выхаду адзін на адзін з варатаром напрыканцы другога тайма, Вячаслаў Глеб стаў не героем, а ўсяго толькі «паўгероем» у вачах галоўнага трэнера, што і агучыў Бернд Штанге на прэс-канферэнцыі. Тым не менш, галоўны трэнер падкрэсліў, што доўгі час Глеб-малодшы знаходзіўся пад крытыкай і цяпер яму важна захаваць тую добрую форму, у якой ён знаходзіцца. Вельмі прыемна, што цяпер ёсць каму замяніць Віталя Кутузава, і што Ягор Філіпенка так удала згуляў, і што Аляксандр Глеб, якога трэнер планаваў замяніць у перапынку, захацеў выйсці і ў другім тайме... «У зборнай ёсць другі касцюм», сыпаў метафарамі Бернд Штанге, падводзячы вынік усім станоўчым момантам першага ў сезоне саліднага спарынгу. Але з такой абаронай мы не зможам супрацьстаяць вядучым зборным свету, гульню каманды па-ранейшаму вызначаюць 6—8 вядучых футбалістаў, а рэалізацыя як заўсёды вымушае жадаць лепшага — гэта з адмоўнага.

Увогуле Бернд Штанге прызнаўся, што расстроены тым, што яго каманда не перамагла ў гэтым паядынку. «У другім тайме мы дамінавалі і заслугоўвалі перамогі, тым больш, што яна нам неабходная ў псіхалагічным плане, паколькі нас чакаюць няпростыя матчы на выездзе з Фінляндыяй і Германіяй і дома з Аргенцінай».

Такім чынам, пакуль перамагло сяброўства. І насуперак жаданню выйграць, парадуемся за зборную, бо магло атрымацца і наадварот.

**Юрый ЖАЎНОЎ:**

— Я лічу, што сёння атрымалася добрая гульня, і мяркую, што тыя балельшчыкі, якія прыйшлі нас падтрымаць у такое надвор'е, не расчараваныя. Лічу, гэта станоўчы вынік для нашай зборнай, бо маглі як выйграць, так і прайграць. Дзесьці не хапіла шанцавання, дзесьці — майстэрства. Сваёй гульнёй быў бы задаволены, калі б згуляў на нуль, а так ёсць пытанні. Што датычыцца саперніка, каманду ўвесь час вёў Ніхат, ад яго зыходзілі ўсе пагрозы.

— У эпізодах, калі прапускалі, былі шанцы адбіць мяч?

— Шанцы заўсёды ёсць. Не так далёка мяч ад мяне праляцеў, крыху нага паехала, не змог як след адштурхнуцца.

**Аляксандр ГЛЕБ:**

— Мы добра згулялі. Поле, вядома ж, не дазволіла праявіць сябе на сто працэнтаў. Але хлопцы вылажыліся, я лічу мы паказалі для гэтай пары года нядрэнны футбол. Вынікам задаволены, але маглі і выйграць, калі б брат больш вытрымана распарадзіўся момантам напрыканцы гульні. Сапернік нічым не здзівіў, Турцыя яна і ёсць Турцыя, мы супраць яе ўжо гулялі. Розніца ў тым, што яны на топ-турніры ўжо трапілі, а мы яшчэ не.

**Віталь КУТУЗАЎ:**

— Футбол атрымаўся цяжкі. Надвор'е складанае, і гульня была скамячанай. Усе стараліся, у кагосьці больш атрымлівалася, у кагосьці менш. Тое, што мог у сваім стане рабіць — зрабіў. У мяне траўма галёнкаступні, мы з трэнерам да гульні дамовіліся, што выйду на тайм, калі пачне непакоіць траўма, папрашу замену. Але так удала склалася, што атрымалася нават гол забіць. Што датычыць нічыёй, то па колькасці момантаў у нас весялей было, але 2:2 добры вынік — каб не было эйфарыі.

**Максім РАМАШЧАНКА:**

— Поле нядрэннае, але крыху недаўкаталі, засталіся купіны, у нас па гэтай прычыне не зусім атрымлівалася гульня ў пас, але ў гэту пару года яно рэдка бывае добрым.

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

## Абзац

■ Беларускія спецназаўцы пройдуць школу выжывання ў джунглях Амазоніі, паведаміў учора журналістам начальнік цэнтра спецыяльнай падрыхтоўкі БФСТ «Дынама» Андрэй Красоўскі, кіраўнік беларускай экспедыцыі ў Венесуэлу, якая адправіцца ў дарогу сёння. Напачатку яны сустрэнуцца са сваімі калегамі ў Венесуэле, абмяняюцца вопытам. Затым адпрацуюць праграму выжывання ў джунглях. Галоўны этап — пад'ём на вышэйшую кропку Венесуэлы, пік Балівара вышынёй 5007 метраў. У складзе каманды — каля 20 чалавек, усе яны прайшлі неабходную падрыхтоўку і медабследаванне.



Фота БЕЛТА.

■ **У адной з гаспадарак Бешанковіцкага раёна карова нарадзіла адразу 4 цялят. Такога мясцовыя ветэрынары не прыпомняць. Паводле слоў спецыялістаў, вельмі рэдка каровы нараджаюць адразу 2 цялят. Траіх — нагул лічылася ўнікальным выпадкам. У віцебскай дзяржаўнай акадэміі ветэрынарнай медыцыны зацікавіліся гэтым фактам і будуць вывучаць рэдкі выпадак.**

■ Савет Федэрацыі па сацыяльнай палітыцы РФ аднагалосна адобрыў ініцыятыву аб усталяванні ў Расіі новага дзяржаўнага свята 8 ліпеня ў Дзень пакравіцеляў святых князёў Пятра і Фяўронні — Усерасійскага дня сужэнцкага кахання і сямейнага шчасця.

■ **Адпачынак у пецярбургскім аквапарку закончыўся для многіх яго наведвальнікаў паездкай у бальніцу. Больш за 150 чалавек атруціліся, як мяркуецца, парамі хлору, купаючыся ў гіперхлараванай вадзе. Больш за 20 чалавек, у асноўным дзеці ва ўзросце ад 6 да 10 гадоў, шпіталізаваныя. Адно дзіця раніцай было пераведзена ў рэанімацыйнае аддзяленне. Расспажыўнагляд часова прыпыніў працу аквапарка.**

■ Верталёт з украінскімі пагранічнікамі ўпаў учора ў Чорнае мора. На яго борце знаходзіліся 13 чалавек (3 члены экіпажа, афіцэры, адзін грамадзянскі пасажыр). Адзін чалавек выратаваны, 7 знайшлі мёртвымі, пошукі астатніх працягваюцца.

■ **Жыхар Ніжняга Тагіла ўкраў з магазіна банкамат з 3 млн рублёў. У чатыры гадзіны раніцы невядомы злачынца ўзламаў замкі, пры дапамозе спецыяльнага пад'ёмніка і бартавога грузавіка «Газэль» вырваў банкамат, што належаў аднаму з буйных банкаў. Пасля таго, як паведамленне аб крадзяжы паступіла ў органы міліцыі, на месца выехала аператыўна-следчая група. Разам з мясцовымі жыхарамі, якія сталі сведкамі гэтага дзёрзкага рабавання, міліцыянерам удалося па гарачых слядах затрымаць зламысніка. Ім аказаўся мясцовы жыхар, які нідзе не працаваў. У хуткім часе міліцыі ўдалося выявіць і грузавік з банкаматам. Злачынца не паспеў украсці адтуль грошы.**

■ Не меней за дзевяць чалавек загінулі, яшчэ дзесяць атрымалі траўмы ў выніку цісканіны ў індуісцкім храме ў цэнтральнай частцы Індыі. Па паведамленні мясцовых уладаў, цісканіна адбылася ў той момант, калі тысячы людзей накіроўваліся ў храм, размешчаны ў невялікім селішчы, на штогадовы кірмаш. Улады называюць здарэнне няшчасным выпадкам.

■ **Жыхар Брытаніі раптоўна мог стаць мультымільянерам, але ўпусціў свой шанц, які выпаў у нацыянальнай латарэі, і не з'явіўся па выйгрыш. Як перадаюць інфармагенцтвы, праз паўгода пасля розыгрышу латарэі прыз у памеры $14 млн будзе ахвяраваны на дабрачыннасць. Па словах арганізатараў нацыянальнай брытанскай латарэі, 27 верасня 2007 года выйгрышны квіток на суму ў 6 989 367 фунтаў стэрлінгаў дастаўся мужчыне, які пражывае ў графстве Дэвон. Аднак увесь гэты час пераможца не з'яўляўся па выйгрыш. Учора ў 17.30 па мясцовым часе мінуў тэрмін, на працягу якога ўладальнік шчаслівага квітка меў права забраць свае грошы.**

## Поўны абзац

■ Галандыя закупіла ў Кітаі 60 мільёнаў драпежных кляшчоў, якія будуць змагацца з іншымі насякомымі-паразітамі, што наносяць шкоду знакамітым галандскім ружам. Гэта першая партыя кляшчоў з Кітая, што адправілася ў Еўропу.

**Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.**

Канферэнц-зала

# Ганарар для неабыякавых грамадзян

## Праваахоўныя органы гатовы плаціць людзям за каштоўныя звесткі, якія дапамогуць раскрыць злачынствы

У барацьбе са злом пракуратура і міліцыя не будуць шкадаваць ні сілаў, ні сродкаў. Прынамсі, як паведаміў учора падчас сустрэчы з журналістамі намеснік Генеральнага пракурора Беларусі Віктар Прус, праваахоўныя органы гатовы плаціць грамадзянам за інфармацыю, якая дапаможа раскрыць забойства ці іншае небяпечнае злачынства, а таксама папярэдзіць парушэнне закона. Зрэшты, канкрэтныя памеры ганарару для неабыякавых грамадзян прадстаўнік пракуратуры не назваў, а толькі загадкава паведаміў, што заахвочванне будзе дастойным. Напрыклад, Віктар Прус адзначыў, што праваахоўныя органы не паскупяцца на ўзнагароду для людзей, якія дапамогуць выйсці на след заказчыка забойства, учыненага ў Мінску ў 1998 годзе. Адказваючы на пытанне «Звязды», намеснік Генеральнага пракурора паведаміў, што па гэтай справе даўно мінулых дзён не так даўно былі арыштаваны 5 падазроных асобаў. Але, мяркуючы па ўсім, гэта толькі выканаўцы. А вось хто выступіў заказчыкам злачынства, следчым пракуратуры пакуль невядома. Віктар Прус ухіліўся ад больш падрабязных каментарыяў памянёнай справы, спаслаўшыся на таямніцу следства. Нават пасаду і род дзейнасці ахвяраў кілераў не паведаміў, заявіўшы толькі, што «гэта ўсе нашы людзі».

*На сёння ў базе звестак праваахоўных органаў знаходзіцца 1351 нераскрытае наўмыснае забойства мінулых гадоў.*

На жаль, няма пакуль зрухаў у расследаванні справы па факце забойства журналісткі Веранікі Чаркасавай, якое было ўчынена ў кастрычніку 2004 года. Расследаванне гэтай справы было прыпынена ў лютым 2007 года. Але, як запэўніў намеснік Генеральнага пракурора, аператыўныя мерапрыемствы ўсё яшчэ праводзяцца. Увогуле, на сёння ў базе звестак праваахоўных органаў знаходзіцца 1351 нераскрытае наўмыснае забойства мінулых гадоў. У вышук аб'яўлены 94 асобы, якія падазраюцца ў здзяйсненні гэтых злачынстваў.

Адметна, што спіс нераскрытых забойстваў істотна не змяншаецца. Хоць за мінулы год былі раскрыты 34 такія злачынствы, якія засталіся ў спадчыну ад мінулых гадоў. Але сёлета са 194 забойстваў нераскрытымі засталіся дзесяць. Прычым роўна палова «глушцоў» (так на міліцэйскім слэнгу называюць амаль безнадзейныя для следчых злачынствы) прыпадае на Брэсцкую вобласць. Гэтаму рэгіёну, дарэчы, сёлета належыць сумны рэкорд — зафіксавана 37 забойстваў.

Паводле слоў Віктара Пруса, следства нярэдка адчувае не толькі востры дэфіцыт інфармацыі. Нашы суграмадзяне не вельмі ахвотна пагаджаюцца выступаць сведкамі на судовых працэсах па крымінальных справах. Таму намеснік Генпракурора заклікаў людзей актыўней праяўляць у такіх выпадках сваю грамадзянскую пазіцыю і абяцаў, што сведкам будзе забяспечана надзейная ахова. Пры неабходнасці такім людзям нават зменяць пашпартныя звесткі, дапамогуць уладкавацца на новым месцы жыхарства. Не пакінуў па-за ўвагай прадстаўнік пракуратуры і самых злачынцаў. Віктар Прус заклікаў парушальнікаў закона не чакаць, пакуль па іх прыйдуць міліцыянеры, а добраахвотна здавацца на літасць правасуддзя. У такіх выпадках, як падкрэсліў намеснік Генеральнага пракурора, вінаватыя могуць разлічваць на змякчэнне пакарання альбо нават на вызваленне ад адказнасці.

**Мікола ДЗЯБЁЛА.**

ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «БЕЛОРУССКАЯ ВАЛЮТНО-ФОНДОВАЯ БИРЖА»
*Адрес: г. Минск, ул. Сурганова, 48а.*

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС

**ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа» по состоянию на 01.01.2008 г.**

*млн руб.*

| АКТИВ | 01.01.2008 |
|---|---|
| **I. Внеоборотные активы,** *всего* | **8 435** |
| *в том числе:* | |
| Основные средства | 7 688 |
| Нематериальные активы | 253 |
| Вложения во внеоборотные активы | 494 |
| **II. Оборотные активы,** *всего* | **15 883** |
| *в том числе:* | |
| Запасы и затраты | 248 |
| Налоги по приобретенным ценностям | 87 |
| Дебиторская задолженность | 2 242 |
| Финансовые вложения | 3 018 |
| Денежные средства | 10 279 |
| Прочие оборотные активы | 9 |
| **БАЛАНС** | **24 318** |
| **ПАССИВ** | **01.01.2008** |
| **III. Капитал и резервы,** *всего* | **24 061** |
| *в том числе:* | |
| Уставный фонд | 8 188 |
| Резервный фонд | 311 |
| Добавочный фонд | 11 762 |
| Доходы будущих периодов | 424 |
| Нераспределенная прибыль | 3 376 |
| **IV. Обязательства,** *всего* | **257** |
| *в том числе:* | |
| Кредиторская задолженность | 256 |
| Резервы предстоящих расходов | 1 |
| **БАЛАНС** | **24 318** |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ

**ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа» за 2007 год**

*(млн руб.)*

| ПОКАЗАТЕЛЬ | |
|---|---|
| **I. Доходы и расходы по видам деятельности** | |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за минусом НДС и иных аналогичных обязательных платежей) | **5 243** |
| Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг | **2 829** |
| Прибыль (убыток) от реализации | **2 414** |
| **II. Сальдо операционных доходов и расходов** | **1 126** |
| **III. Сальдо внереализационных доходов и расходов** | **-565** |
| **IV. ИТОГО ПРИБЫЛЬ ЗА ОТЧЕТНЫЙ ПЕРИОД** | **2 975** |
| **V. Налоги и сборы, производимые из прибыли** | **1 033** |
| **VI. ПРИБЫЛЬ К РАСПРЕДЕЛЕНИЮ** | **1 942** |

Справочно *(млн руб.)*

| ПОКАЗАТЕЛЬ | |
|---|---|
| Долгосрочная дебиторская задолженность | **1 209** |
| Количество акционеров, всего | **98** |
| *в том числе:* | |
| - юридических лиц | **93** |
| - физических лиц | **5** |
| Обеспеченность акций имуществом Общества (тыс. руб.) | **0,577** |

Годовая бухгалтерская отчетность Общества подтверждена аудиторской организацией ООО «ПрофитАудит», специальное разрешение (лицензия) на осуществление аудиторской деятельности № 02200/0061722, выданное на основании решения Министерства финансов Республики Беларусь от 12 марта 2004 года № 102 и действительное до 2009 г. *УНП 101541722*

ГОДОВОЙ ОТЧЕТ ЭМИТЕНТА

## ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «БЕЛФА» г. Жлобин

*Гомельская обл., г. Жлобин, Красный проезд, 2*

**ГОДОВОЙ БАЛАНС на 01.01. 2008 г.**

*млн руб.*

| Наименование показателя | Код строки | На начало года | На конец отчетного периода |
|---|---|---|---|
| **АКТИВ** | | | |
| 1. Внеоборотные активы | 190 | 46772 | 52565 |
| 2. Оборотные активы | 290 | 19603 | 22159 |
| **БАЛАНС** | **390** | **66375** | **74724** |
| **ПАССИВ** | | | |
| 3. Капитал и резервы | 490 | 62117 | 70607 |
| в т. ч. уставный фонд | 410 | 192 | 192 |
| 4. Обязательства | 590 | 4258 | 4117 |
| **БАЛАНС** | **600** | **66375** | **74724** |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за 2007 год**

| Наименование показателя | За 2007 год | За 2006 год |
|---|---|---|
| 1. Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг ( за минусом НДС, акцизов и аналогичных обязательных платежей) | 62014 | 58824 |
| 2. Себестоимость реализации товаров, продукции, работ, услуг | 52869 | 49545 |
| 3. Расходы на реализацию | 1145 | 1167 |
| 4. Прибыль от внереализационных, операционных доходов и расходов | -2327 | -2168 |
| 5. Прибыль за отчетный период | 5673 | 5944 |
| 6. Налоги и сборы, платежи и расходы, производимые из прибыли | 2474 | 2408 |
| 7. Нераспределенная прибыль | 3199 | 3536 |

**ИНФОРМАЦИЯ ОБ ОТКРЫТОМ АКЦИОНЕРНОМ ОБЩЕСТВЕ И ЕГО ДЕЯТЕЛЬНОСТИ**

1. Количество акционеров, всего — 5624, в т.ч. юридических лиц — 3, физических лиц — 5621
2. Информация о дивидендах и акциях

| Наименование показателя | Единица измерения | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | млн руб. | 279 | 283 |
| Дивиденды, приходящиеся на 1 акцию (включая налоги) | рублей | 102 | 103 |
| Обеспеченность акции имуществом Общества | тыс. руб. | 23,4 | 20,5 |
| Количество простых акций, находящихся на балансе Общества | штук | — | — |
| 3. Информация о задолженности | | | |
| Просроченная дебиторская задолженность | млн руб. | 0 | 0 |
| Просроченная кредиторская задолженность | млн руб. | 0 | 0 |

4. Среднесписочная численность работающих (чел.) — 1536
5. Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено 93,5 % выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг:
- трикотажное полотно (искусственный мех);
- изделия из трикотажного полотна (искусственного меха).

**Генеральный директор** **М.Г. Костылев**
**Главный бухгалтер** **Е.В. Иванченко**

УНП 400076540

## ОАО «Мальва»

*(адрес: г. Минск, ул. Коржа, 11) извещает акционеров*
**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ с 1 января 2007 г. по 31 декабря 2007 г.**

| Наименование показателей | Код стр. | За отчетный период в тыс. руб. |
|---|---|---|
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 020 | 4 446 389 |
| Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг | 030 | 3 378 326 |
| Расходы на реализацию | 050 | 1 076 373 |
| Прибыль (убыток) от реализации | 060 | -8 310 |
| Прибыль (убыток) от операционных доходов и расходов | 120 | 30 002 |
| ИТОГО ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) ЗА ОТЧЕТНЫЙ ПЕРИОД | 200 | 21 692 |
| Налоги и сборы, платежи и расходы, производимые из прибыли | 210 | 7 270 |

УНП 100041360

**Страховые полисы ЗАСО «Белнефтестрах»** по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории Республики Беларусь **серия АД 8411510 — 8411514; 8434280 считать недействительными.**

## ОАО «Минский приборостроительный завод»

**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ:**

**Лот 1** Токарно-винторезный станок мод. Е3N-01, 1980 г.в., начальная цена 450 000 бел. руб. с НДС

**Лот 2** Токарно-винторезный станок мод. SV-18RA, 1981 г.в., начальная цена 750 000 бел. руб. с НДС

**Лот 3** Токарно-винторезный станок мод. 1К625, 1969 г.в., начальная цена 1 200 000 бел. руб. с НДС

**Лот 4** Токарно-винторезный станок мод. 1К62, 1970 г.в., начальная цена 900 000 бел. руб. с НДС

**Лот 5** Вертикально-сверлильный станок мод. 2Н125, 1978 г.в., начальная цена 80 000 бел. руб. с НДС

**Лот 6** Настольно-сверлильный станок мод. 2М112, 2000 г.в., начальная цена 60 000 бел. руб. с НДС

**Лот 7** Верстак слесарный ВС-24-5 шт., 1985 г.в., начальная цена 100 000 бел. руб. с НДС каждый

**Лот 8** Круглошлифовальный станок мод. 3У10МАФ10, 1991 г.в., начальная цена 6 800 000 бел. руб. с НДС

**Всю необходимую информацию можно получить по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 58. Контактный телефон 8 (0172) 93 94 33. Факс 331 41 97.**

**Аукцион состоится 30 апреля 2008 г. в 13.00 по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 58.**

**Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 29 апреля до 17.00.**

УНП 100363840

## ЗАСО «ГАРАНТИЯ» г. Мозырь за 2007 год

**Бухгалтерский баланс**

*млн руб.*

| АКТИВ | |
|---|---|
| 1 | 2 |
| **Основные средства** | **27,0** |
| **Нематериальные активы** | **45,3** |
| **Финансовые вложения, всего** | **293,4** |
| в том числе: инвестиции в дочерние общества | — |
| инвестиции в другие организации | 3,5 |
| облигации и другие долговые обязательства | 289,9 |
| прочие финансовые вложения | — |
| **Доля перестраховщиков в страховых резервах** | **104,9** |
| **Дебиторы, всего** | **16,1** |
| в том числе: дебиторская задолженность по операциям страхования, сострахования и перестрахования | 0,1 |
| депо премий по рискам, принятым в перестрахование | — |
| дебиторская задолженность (кроме операций страхования, сострахования и перестрахования | 16,0 |
| **Прочие активы, всего** | **1572,5** |
| в том числе: незавершенное строительство | — |
| материальные ценности затраты | 8,9 |
| денежные средства | 1563,6 |
| собственные акции (доли) | — |
| прочие активы | — |
| **Непокрытые убытки прошлых лет** | — |
| **Непокрытые убытки отчетного года** | — |
| **БАЛАНС** | **2059,2** |

| ПАССИВ | |
|---|---|
| 3 | 4 |
| **Источники собственных средств, всего** | **1138,2** |
| в том числе: уставный фонд | 475,3 |
| резервный фонд | 7,2 |
| добавочный фонд | 365,0 |
| фонд накопления | 240,4 |
| фонд потребления | 0,4 |
| целевое финансирование | — |
| нераспределенная прибыль прошлых лет | 26,5 |
| нераспределенная прибыль отчетного года | 23,4 |
| **Страховые резервы и фонды, всего** | **668,5** |
| в том числе: страховые резервы | 659,4 |
| фонд предупредительных (превентивных) мероприятий | 9,1 |
| гарантийные фонды | — |
| **Кредиторы, всего** | **54,5** |
| в том числе: кредиторская задолженность по операциям страхования, сострахования | — |
| кредиторская задолженность по операциям перестрахования | — |
| депо премий по рискам, переданным в перестрахование | — |
| заемные средства | — |
| кредиторская задолженность (кроме операций страхования, сострахования, перестрахования) | 54,5 |
| **Прочие пассивы** | **198,0** |
| **БАЛАНС** | **2059,2** |

Достоверность баланса подтверждена независимой аудиторской организацией ОДО «ПРОМАУДИТ» г. Минск, лицензия на осуществление аудиторской деятельности № 02200/0061721 выдана Министерством финансов РБ 03 февраля 2004 г.

**Отчет о финансовых результатах ЗАСО «ГАРАНТИЯ» г. Мозырь за 2007 год**

*млн руб.*

| Наименование показателя | Код строки | За отчетный период |
|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 |
| **I. Страхование жизни** | | |
| Страховые взносы (премии) | 010 | — |
| Страховые выплаты | 020 | — |
| Изменение резерва по страхованию жизни (+ или -) | 030 | — |
| Отчисления в гарантийный фонд | 040 | — |
| Расходы на ведение дела | 041 | — |
| **Результат от операций по страхованию жизни (+ или -)** | 050 | — |
| **II. Страхование иное, чем страхование жизни** | | |
| Страховые взносы (премии) — нетто перестрахование | 064 | 434,1 |
| Изменение резерва незаработанной премии — нетто перестрахование (+ или -) | 067 | 3,9 |
| Оплаченные убытки (страховые выплаты) — нетто перестрахование | 082 | 289,3 |
| Изменение резервов убытков — нетто перестрахование (+ или -) | 092 | 124,2 |
| Изменение других технических резервов (+ или -) | 100 | — |
| Изменение иных страховых резервов (+ или -) | 105 | — |
| Отчисления в фонд предупредительных (превентивных) мероприятий и гарантийные фонды | 110 | 1,9 |
| Расходы на ведение дела | 120 | 188,5 |
| Комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, переданным в перестрахование | 121 | 2,1 |
| Комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, принятым в перестрахование | 122 | 1,2 |
| **Результат от операций по видам страхования иным, чем страхование жизни (+ или -)** | 130 | 83,4 |
| **III. Прочие доходы и расходы, не отнесенные в разделы I и II** | | |
| Операционные доходы | 140 | 1410,8 |
| Операционные расходы | 145 | 1256,3 |
| Внереализационные доходы | 150 | 61,8 |
| Внереализационные расходы | 155 | 157,7 |
| Финансовый результат | 157 | 142,0 |
| Использовано прибыли | 158 | 118,6 |
| **Нераспределенная прибыль (убытки) отчетного периода (+ или -)** | 170 | 23,4 |

По нашему мнению, бухгалтерская (финансовая) отчетность закрытого акционерного страхового общества «ГАРАНТИЯ» отражает достоверно во всех существенных отношениях его финансовое положение на 1 января 2008 года и результаты финансово-хозяйственной деятельности за 2007 год.

УНП 400217363

Зваротная сувязь: радкі з пісьмаў

## Шаноўная «Звязда»!

Будзь і надалей чулай, клапатлівай, спагадлівай.

...А чаму б у кожным нумары не друкаваць выказванні чытачоў?

Хопіць крыміналу! А калі друкуеце, дык указвайце асобу злачынцы. Няхай пра гэта ведаюць родныя, землякі. Мо тады чалавек задумаецца, што ганьбіць родных.

Пастаянны чытач і падпісчык

**М. НЕВЯДОМСКІ,** *г. Мінск.*

**Ад рэдакцыі:**

*Указваць прозвішчы асобаў, затрыманых па падазрэнні ў правапарушэннях, а тым больш называць іх злачынцамі рэдакцыя не мае права — гэта можа зрабіць толькі суд.*

*Згодна з артыкулам 26 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, ніхто не можа быць прызнаны вінаватым у злачынстве, калі яго віна не будзе ў прадугледжаным законам парадку даказана і ўстаноўлена прыгаворам суда, які ўступіў у законную сілу.*

Пытальнік

## Ці ёсць уплыў на здароўе ад падфарбаванага паліва?

*У вёсцы ніхто не правярае ні трактар, ні машыну: колькі шкодных рэчываў (і якіх) выкідваецца ў атмасферу і людзям пад нос ад падфарбаванага хіміяй каляровага паліва. Выхлапныя газы настолькі смярдзючыя, што па вуліцы немагчыма прайсці, калі праедзе МАЗ ці трактар. На мехдвары, калі працуе тэхніка, немагчыма знаходзіцца, чаго раней не было: патрэбны процівагаз. Людзі хвалююцца за ўласнае здароўе і здароўе сваіх дзяцей. Хацелася б, каб гэты ліст вы накіравалі ў камітэт па ахове здароўя, можа, у іх ёсць лабараторыя, якая праверыць на таксічнасць і шкоднасць для здароўя падфарбаванага паліва. Якія хваробы можа набыць чалавек ад удыхання выхлапных газаў з гэтай хіміяй, паколькі яна з арганізма не выводзіцца, а назапашваецца. На ўсіх атрутах маецца надпіс — як вывесці з арганізма ў выпадку ўдыхання ці атручэння. А тут ніякай інфармацыі ні на запраўцы, ні ў гаспадарцы... Дзе гарантыя, што не адбудзецца новы ўсплёск анкалогіі, алергіі і іншых захворванняў? Бо гэта хімія з выхлапнымі газамі будзе асядаць і на прадуктах раслінаводства, а затым трапляць у ежу... Хацелася б атрымаць падрабязны адказ, бо сітуацыя датычыцца не аднаго чалавека, а ўсёй сельскай мясцовасці і нават горада, паколькі калгасныя аўтамабілі ездзяць нават па Мінску. Сімптомы пасля кантакту з выхлапнымі газамі такія: сухасць у роце, горле, часам болі ў грудзях, баліць галава.*

**Ад імя механізатараў і вадзіцеляў РСУП «Саўгас Гарадок»**
**С.В. ПРАТАСЕВІЧ,** *в. Вароцішчы Уздзенскага раёна.*

Трэба зазначыць, што гэта ўжо другі ліст чытача ў рэдакцыю. Першы быў накіраваны ў абласны камітэт прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. Адказу адтуль мы так і не атрымалі, хоць ён быў дасланы самому заяўніку. Паводле яго слоў, рэагаваннем ён застаўся незадаволены, паколькі яму паведамілі, што дадзенае пытанне не ўваходзіць у іх кампетэнцыю. У чыю тады? У пошуках інфармацыі мы звярталіся ў інспекцыю Дзяржтэхнагляду Уздзенскага раёна, раённы і абласны цэнтры гігіены і эпідэміялогіі, але...

Усё, што ў нас атрымалася, гэта высветліць, адкуль бярэцца падфарбаванае паліва. Па сутнасці, яно самае звычайнае. Перад самай адпраўкай для патрэбаў сельскай гаспадаркі ў яго дадаюць спецыяльныя фарбавальнікі, якія надаюць яму колер. Робіцца гэта спецыяльна, каб прадухіліць выпадкі крадзяжу паліва — афарбоўка адразу выдасць, адкуль яно ўзялося. «Белнафтахім» быццам бы разаслаў паперу, што фарбавальнікі адпавядаюць усім неабходным патрабаванням, г.зн. не павінны наносіць шкоду здароўю чалавека. Тэхнічныя ўмовы на афарбаванае паліва павінна было распрацаваць Міністэрства аховы здароўя, у некаторых спецыялістаў, да якіх мы звярталіся, было толькі пісьмо з Дзяржстандарта з рэкамендацыямі... Па ўскосных выказваннях асобных суразмоўцаў мы зразумелі, што агучаная чытачом праблема ўжо ўздымалася на некаторых нарадах, аднак адказу на пастаўленыя пытанні спецыялісты не атрымалі. Зразумела, пакуль не будуць праведзены адпаведныя даследаванні (напрыклад, раённы цэнтр гігіены і эпідэміялогіі не акрэдытаваны на правядзенне замераў паветра на тэрыторыі населеных пунктаў і працоўных месцах), гаварыць нешта, зрэшты, як і адназначна пагаджацца са словамі чытача, не выпадае. Як падказалі нам, неабходныя звесткі найбольш верагодна атрымаць з Міністэрства аховы здароўя. Будзем чакаць.

## У чым перавагі аквачысткі?

*Апошнім часам некаторыя сталічныя хімчысткі прапануюць новую тэхналогію — аквачыстку. Хацелася б даведацца, у чым яе перавагі і ці гарантуе новая тэхналогія стопрацэнтнае выдаленне плямаў на адзенні?*

**С.М. ШАЎКОВІЧ**, *г. Мінск.*

У апошнія гады з'явілася мноства новых матэрыялаў, якія нельга ачышчаць класічным спосабам у арганічных растваральніках, напрыклад, плашчовыя тканіны з палімерным пакрыццём, шлюбныя сукенкі, штучную замшу. Для аздаблення адзення нярэдка выкарыстоўваюцца ўстаўкі са штучнай скуры, карункі, розная фурнітура, якія таксама непажадана падвяргаць ачышчэнню традыцыйным спосабам.

Вырабы, якія ўтрымліваюць ацэтатныя, віскозныя валокны, павінны падвяргацца толькі сухой чыстцы. Пры ёй не выкарыстоўваюцца водныя растворы. Сухая чыстка ажыццяўляецца ў арганічным растваральніку перхлорэтылене. Папярэдне адбываецца апрацоўка спецыяльнымі прэпаратамі для выдалення плямаў. Аднак калі плямы застарэлыя і ўжо праніклі ўнутр валокнаў, утварыўшы там трывалыя спалучэнні, гэта можа стаць сур'ёзнай праблемай нават для прафесіяналаў. Нярэдка самі кліенты спрабуюць самастойна выдаліць пляму, выкарыстоўваючы пры гэтым розныя сродкі ці парады з кніг па вядзенні хатняй гаспадаркі. Таму пры выкарыстанні прафесійных сродкаў, прызначаных для выдалення пэўных відаў плямаў, не адбываецца жаданай хімічнай рэакцыі, і пляма не знікае ці пакідае на тканіне разводы. Самастойна замываць можна толькі плямы ад крыві і малака, але адразу пасля таго, як яны трапілі на тканіну, у халаднаватай вадзе і пажадана з гаспадарчым мылам. А вось выдаленне маслянай фарбы і іншых рэчываў, якія маюць афарбоўваючы кампанент, а таксама жавальнай гумкі з адзення, магчымае толькі ва ўмовах хімчысткі, інакш вакол выдаленай плямы застанецца светлы арэол.

Плямы ад віна, сокаў, гарбаты, харчовыя плямы выдаляюцца толькі прэпаратамі, якія ўтрымліваюць ваду. У гэтым выпадку кліентам прапануецца аквачыстка. Аквачыстка, заўважым, прызначана для найбольш далікатных тканін, тэкстылю, скуры, футра, а таксама яна цудоўна падыходзіць для мяккіх цацак. Для ачышчэння вырабаў з чыстага шоўку і сучасных сінтэтычных матэрыялаў, а таксама для вырабаў са спецыяльным прамочваннем і розным пакрыццём аквачыстка найбольш эфектыўная і бяспечная. Пры аквачыстцы выкарыстоўваюцца высокаэфектыўныя прэпараты, якія змяншаюць эфект звальвання шэрсці, усадку вырабу і дазваляюць пазбегнуць пераходу фарбавальніка. Аквачыстка — гэта далікатная чыстка, якая адбываецца ў сучасных машынах з выкарыстаннем прафесійных мыйных сродкаў, распрацаваных для розных груп матэрыялаў: тэкстылю, скуры і футра. Вырабы пасля аквачысткі больш чыстыя, свежыя і прыемныя ў параўнанні з працэсам чысткі ў арганічных растваральніках. Адна з пераваг аквачысткі — яе экалагічнасць і поўная адсутнасць рэшткавага паху ад растваральніка.

І напрыканцы яшчэ адна парада ад прафесіяналаў — сезоннае адзенне трэба прыводзіць у парадак адразу пасля заканчэння сезона. Чым больш часу пляма застаецца на вырабах, тым менш шанцаў ад яе пазбавіцца. Дарэчы, бруд, нават нябачны для вока, таксама псуе тканіны, і адзенне больш хутка страчвае свой таварны выгляд.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Здароўе будучыні

## ДВА БАКІ ГЕНЕТЫЧНАГА ПАШПАРТА

**У падмурку любога захворвання можна адшукаць прыродную схільнасць. Хтосьці скажа: а вось і няпраўда. Маўляў, зламаў чалавек нагу — пры чым тут схільнасць? А пры тым, што ў яго косці слабыя, напрыклад. Тое ж самае і з вірúснымі інфекцыямі. Адзін чалавек часта хварэе, а другі можа пры штодзённых кантактах з хворымі быць здаровым і не «кашляць».**

Хоць, безумоўна, на фоне гэтай самай спадчыннасці важны і лад жыцця. Іншымі словамі, прыродная схільнасць можа не праявіцца. Праўда, для гэтага варта шмат ведаць і прыкладаць пэўныя намаганні, паколькі паходжанне ўсіх хваробаў заўсёды абумоўлена шэрагам фактараў.

Дарэчы, беларускія вучоныя вывучаюць цяпер схільнасць да сардэчна-сасудзістых хваробаў. У прынцыпе, яна можа быць не абавязкова 100-працэнтнай. Гэта выражанасць якраз і даследуецца. Сёння па кроплі крыві генетыкі могуць сказаць, у каго менавіта і ў якой ступені ёсць схільнасць да ішэміі. На жаль, даследаванні не практыкуюцца для шырокага кола ахвотнікаў, — у рэспубліцы проста не існуе ўстановы, якая прапанавала б такія паслугі.

Наогул сёння ідзе гаворка аб тым, што калі-небудзь у кожнага, хто захоча, будзе генетычны пашпарт. Мы будзем ведаць, дзе нам можна жыць, што нам можна ўжываць, каму лепш займацца ў трэнажорнай зале, а каму — бегаць на вялікія дыстанцыі... Вось, напрыклад, не ўсім можна піць прэпараты жалеза — «паляцяць» суставы... Як жа аб гэтым даведацца? Навука ўжо гатова адказаць на падобныя пытанні. Беларусы маглі б атрымаць генетычны пашпарт аб магчымасці развіцця шэрагу захворванняў. Але пакуль гаворка ідзе аб маральным аспекце пытання. Дакладна не ўстаноўлена, аб якіх захворваннях варта паведамляць чалавеку. Ёсць жа, напрыклад, і хвароба Альцгеймера, прадухіліць якую немагчыма ніякімі прафілактычнымі сродкамі. Спецыялісты апасаюцца, што такім людзям складана будзе жыць з адчуваннем непазбежнай катастрофы, веды могуць парушыць яго планы абзавесціся сям'ёй, знайсці работу па душы і г.д. Каму павінна быць даступна такая інфармацыя — хвораму, яго блізкім, урачам? Тым не менш, інфармацыя аб тых хваробах, якія паддаюцца папярэджванню, можна было прадастаўляць ужо цяпер. Магчыма, гэта дазволіла б некаторым з нас па-іншаму паглядзець на курэнне ці маларухомы лад жыцця.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**



# ЯДЗЕРНАЯ ЭНЕРГЕТЫКА: РАШЭННЕ ПРЫНЯТА, І ЯНО — АБГРУНТАВАНАЕ

Карэспандэнт «Звязды» гутарыць з Міхаілам Паўлавічам Кандрацьевым — саветнікам генеральнага дырэктара акцыянернага таварыства «Белэнергабуд», кіраўніком «Белэнергабуда» ў 1985—2003 гадах, прафесарам, акадэмікам Міжнароднай інжынернай акадэміі, заслужаным энергетыкам Мінпаліваэнерга і Адзінай энергетычнай сістэмы Расіі, заслужаным будаўніком Рэспублікі Беларусь



**У рэспубліцы прынята канчатковае рашэнне аб будаўніцтве атамнай электрастанцыі. Няйначай, не ўсе з прыхільнасцю сустрэлі гэта рашэнне, у нас яшчэ добра памятаюць пра чарнобыльскую трагедыю. І, тым не менней, варта прызнаць гэта рашэнне як цалкам абгрунтаванае. Галоўная выснова: сёння мы не можам гаварыць пра нашу энергетычную самадастатковасць і ў цэлым пра нашу належную энергетычную бяспеку. Так, падчас гутаркі падкрэслівалася: развітыя краіны маюць не менш за адзін мільён кілават энергамагутнасцяў з разліку на адзін мільён жыхароў, мы ж на сёння маем усіх энергамагутнасцяў 7,8 мільёна кілават.**

**Тое, што сваю энергетычную гаспадарку мы павінны развіваць далей, — гэта бясспрэчна. Тым болей, што энергетыка павінна мець на ўвазе не толькі бягучыя, але і доўгачасовыя задачы ўстойлівага развіцця краіны. Іншая справа: якія пры гэтым выбраць шляхі, якія з іх найбольш перспектыўны і эканамічна апраўданы? Скажам, можна ўзводзіць, як і раней, новыя цеплавыя станцыі, выключна якія і забяспечваюць цяперашнюю выпрацоўку ў краіне цяпла і электраэнергіі. Аднак пры гэтым будзем мець на ўвазе пастаянна растучы кошт традыцыйнага арганічнага паліва, якое выкарыстоўваецца на іх, — газу і нафты. Прычым спецыялісты папярэджваюць: запасы газу і нафты ў свеце — абмежаваныя. Да таго ж варта мець на ўвазе такі даволі цікавы факт: аказваецца, цяпер да 80 працэнтаў выпрацаванай у свеце электраэнергіі спажываюць усяго 20 працэнтаў насельніцтва. Словам, рэзерв для росту энергаспажывання ёсць. І вельмі значны. Калі б усе на Зямлі спажывалі электраэнергіі столькі ж, колькі спажываюць самыя «прасунутыя» ў гэтых адносінах краіны (а справа да гэтага ідзе, у прагрэсе не адмовіш нікому), спальваючы для адпаведных мэтаў арганічнае паліва, яго запасы выбіраліся б яшчэ намнога больш імклівымі тэмпамі. Адпаведна, і кошт арганічнага паліва пры такой сітуацыі не можа не расці, і пагроза яго дэфіцыту цалкам верагодная.**

Нельга ў рэспубліцы рабіць стаўку і на іншыя спосабы атрымання энергіі. Напрыклад, на гідрарэсурсы — яны ў нас не вельмі значныя. Не выратуе нас і нашу энергетычную бяспеку і даволі папулярная цяпер драўніна, якая перапрацоўваецца на шчэпку, а потым спальваецца ў катлах міні-ЦЭЦ. Для таго, каб, напрыклад, забяспечыць работу такой станцыі, як Лукомская ДРЭС, няйначай, гэту драўніну давялося б збіраць амаль па ўсёй рэспубліцы (для даведкі: Лукомская ДРЭС у свой час спажывала па 10—11 тысяч тон мазуту за суткі).

У многіх краінах свету на змену традыцыйным крыніцам энергіі ўсё больш прыходзіць энергія расшчэпленага ядра атама. Ці можа рэспубліка адгарадзіцца ад гэтага руху? Прычым з улікам таго, што той жа атам ужо цяпер падпірае нас з усіх бакоў. Нагадаем, на поўначы гэта Ігналінская АЭС, на ўсходзе — Смаленская, на поўдні — Чарнобыльская, Ровенская і Хмяльніцкая, а ў перспектыве павінна з'явіцца атамная станцыя і ў польскім прыгранічча. Па сутнасці, ядзерная энергетыка, развіццё якой у нашай рэспубліцы істотна затармазіла тая ж чарнобыльская трагедыя, наступае нам на пяткі...

Да ўсяго гэтага можна дадаць: нават у Расіі, якая, не параўноўваючы з намі, вельмі добра забяспечана энерганосьбітамі, сваё далейшае развіццё ў многім звязваюць з ядзернай энергетыкай. Напрыклад, у адным з артыкулаў у часопісе «Энергія» зазначаецца: «У цэлым рэсурсныя і, магчыма, экалагічныя абмежаванні, калі іх не ўдасца пераадолець, могуць стварыць цяжкія праблемы ў эканоміцы Расіі і яе энергетычнай бяспецы, калі не разглядаць пры гэтым ядзерную энергію».

Аднак адпаведнае рашэнне прынята, краіна ўжо ў хуткім часе прыступіць да яго практычнай рэалізацыі — што пры ўзвядзенні АЭС важна мець на ўвазе ў першую чаргу? Такое пытанне і было зададзена Міхаілу Паўлавічу Кандрацьеву на самым пачатку.

Тут жа нагадаем: **Міхаіл Паўлавіч Кандрацьеў — непасрэдны ўдзельнік ліквідацыі наступстваў чарнобыльскай аварыі, правёў у 1986 годзе ў яе раёне, у тым ліку і на пашкоджаным блоку, больш за 4 месяцы. Тым не менш, ён даўно і настойліва выступаў за развіццё ў нашай краіне ядзернай энергетыкі.**

— Безумоўна, больш за ўсё важна мець поўную, стопрацэнтную гарантыю бяспекі пры атрыманні ядзернай энергіі, падчас усяго тэхналагічнага працэсу — пачынаючы ад дастаўкі ядзернага паліва і заканчваючы пахаваннем яго адходаў.

Звернемся да той жа чарнобыльскай аварыі — чаму яна здарылася? Прычым адразу ж зазначу: гэта быў не ядзерны выбух, як часам гавораць, а цеплавы. Дык вось, чацвёрты блок павінны былі вывесці з работы. Пры гэтым была распрацавана праграма, згодна з якой трэба было правесці вымярэнні, колькі электраэнергіі выпрацоўваецца за час поўнага спынення блока. Але ў выніку памылковых дзеянняў персаналу і адбыўся той жа цеплавы перагрэў рэактара.



Ці магчымае паўтарэнне падобнай сітуацыі цяпер? Ні ў якім разе. Урокі Чарнобыля, а таксама ўрокі аварыі на АЭС «Тры Майл Айленд-2» у ЗША не прайшлі дарма. У сучасных рэактарах забяспечваецца так званая глыбокаэшаланаваная абарона, якая мае пяць узроўняў яе арганізацыі. Адзін з асноўных прынцыпаў гэтай абароны — сумяшчэнне ў рабоце станцыі функцый бяспекі і эксплуатацыі. Што гэта азначае на практыцы? Гэта азначае, што калі падчас эксплуатацыі станцыі намячаецца так званая няштатная сітуацыя, адхіленні тэхналагічнага працэсу ад вызначаных параметраў, рэактар тут жа аўтаматычна заглушыцца. Прадугледжаны спецыяльныя ўстройствы (яны таксама спрацоўваюць самастойна, аўтаматычна) для ўводу ў дзеянне, на выпадак тых жа няштатных сітуацый, сістэм бяспекі. Гэта таксама іншыя меры перасцярогі. Увогуле, бяспека сучасных АЭС павысілася ў сотні тысяч разоў, у сучасныя рэактары ўнесена мноства адпаведных змяненняў. Паўтарэнне сітуацый, падобных на чарнобыльскую, немагчымае ўжо па той простай прычыне, што ў сучасных рэактарах, на сучасных атамных станцыях закладваецца сістэма абароны, разлічаная на зусім ужо неверагодныя дзеянні персаналу, або, як часам называюць такія сістэмы, накіраваная супраць дурня. І яшчэ: чарнобыльская аварыя не мела б такіх непрыемных наступстваў, калі б рэактар пры яго ўзвядзенні быў заключаны ў маналітную бетонную абалонку. Аднак з мэтай эканоміі сродкаў гэта абалонка вакол яго была ўзведзена са зборных жалезабетонных канструкцый, якія лёгка «раздзьмула» пры ўзрыве.






Яшчэ раз падкрэслю: поўная бяспека АЭС — гэта найважнейшая ўмова яе ўзвядзення ў нас. Разам з тым многім з нас трэба пераадольваць і гэтак званы чарнобыльскі сіндром. Навукова-тэхнічны прагрэс — не спыніш, і мы таксама не павінны застацца ад яго ўбаку. Увогуле, сучаснага чалавека ўжо нельга прымусіць жыць у зямлянцы з лучынай. Ці, можа, пакінем гэту лучыну нашым унукам? На наш век традыцыйных крыніц энергіі, напэўна, хопіць, але вось пытанне: а што далей?

***— Міхаіл Паўлавіч, наконт неабходнасці выкарыстання ядзернай энергіі як быццам усё зразумела, якія плюсы яна мае пры гэтым?***

— Назаву іх. Адзін з найбольш важкіх плюсоў: пры спальванні аднаго кілаграма атамнага паліва або расшчапленні аднаго кілаграма ўрану, можна атрымаць 23 мільёны кВт-гадзін электрычнай энергіі, а пры спальванні аднаго кілаграма газу, нафты, вугалю мы маем, адпаведна, усяго 14,9, 12,6 і 8,2 кілават-гадзіны. Велічыні проста непараўнальныя. Далей. У кошце электраэнергіі, атрыманай ад АЭС, кошт паліва звычайна складае 1,2—1,7 цэнта на кілават-гадзіну. Невядома, колькі ўжо ў хуткім часе будзе каштаваць для нас «газавая» кілават-гадзіна, але, няйначай, пры існуючых тэндэнцыях, значна болей. А паглядзім, колькі шкоды прыносіць выкарыстанне арганічнага паліва навакольнаму асяроддзю. У прыватнасці, сусветная энергетыка з'яўляецца крыніцай штогадовага паступлення ў атмасферу 140—180 мільёна тон такога вельмі шкоднага газу, як дыяксід серы; ад цеплавых станцый у атмасферу штогод выкідваецца каля 2,3 мільярдаў тон дыяксіду вугляроду... Дымавыя шлейфы, што сцелюцца ад іх, маюць пры гэтым тую ж і нават большую радыеактыўнасць у параўнанні з выкідамі на атамных станцыях.

***— З якімі праблемамі сутыкаецца сёння наша энергетыка?***

— Асноўная з іх — вялізны дэфіцыт танных энерганосьбітаў, на замену якіх і павінна прыйсці энергія расшчэпленага атамнага ядра. Далей: у цэлым нашы энергамагутнасці маюць немалы працэнт зносу (дарэчы, сёння мы выпрацоўваем за год 31—32 мільярды ўласных кілават-гадзін пры патрэбнасці каля 34,5—36,5 мільярда). Возьмем тую ж Лукомскую ДРЭС. Першы энергаблок на ёй пусцілі ў 1969 годзе, апошні — у 1974-м. Рэсурс станцыі разлічаны на 25 гадоў — ужо 10 гадоў перабралі.

У рэспубліцы склалася вельмі нездавальняючая сітуацыя са структурай спажывання паліва пры вытворчасці энергіі. У прыватнасці, мы маем цяпер у гэтай структуры ажно 85 працэнтаў газу, а апошні, яшчэ раз нагадаем, пастаянна расце ў цане. А напрыклад, у ЗША структура вытворчасці электраэнергіі наступная: 70,8 працэнта яе вырабляецца на цеплавых станцыях, 19,8 — на атамных, 7,2 — на ГЭС, 2,2 — за кошт іншых крыніц. Пры гэтым долі энерганосьбітаў, якія ідуць на выпрацоўку электраэнергіі на цеплавых станцыях, складаюць такія прапорцыі, у працэнтных адносінах: вугаль — 73 працэнты, мазут — 4, газ — 23. Звернем увагу: доля газу складае ўсяго 23 працэнты. Доля газу, які ідзе на выпрацоўку энергіі, меншая нават у багатай на яго Расіі.



Увогуле, энергетыка павінна развівацца бесперапынна, апераджальнымі тэмпамі. Будзем памятаць пра той вынік, які не так даўно атрымалі ў Расіі з энергазабеспячэннем Масквы — становішча там складвалася амаль катастрафічнае. А ўсё з-за чаго? З энергетыкі, па сутнасці, толькі выціскалі грошы і імкнуліся выціснуць як мага болей. А вось пра тое, каб укладваць іх, хоць бы частку, у развіццё энергамагутнасцяў, — неяк забываліся...

***— Міхаіл Паўлавіч, такое пытанне: ці можа «Белэнергабуд» узяць на сябе функцыі генеральнага падрадчыка па ўзвядзенні АЭС, ці гатовы ён да гэтага?***

— Пачну з таго, што некалі менавіта «Белэнергабуду» было даручана ўзводзіць Мінскую АЦЭЦ, якую, між іншым, будавалі за сродкі саюзнага бюджэту, а цяпер трэба за свае. (Дарэчы, мяне і прызначылі тады, у сувязі з гэтым будаўніцтвам, узначаліць «Белэнергабуд».) І гэта будаўніцтва, увогуле, ішло паспяхова. Пачалі мы будаваць Мінскую АЦЭЦ у 1983 годзе, а ў 1989 годзе павінны былі здаць першы энергаблок. Нашымі будаўнікамі была створана выдатная прамысловая база, пабудаваны пасёлак на 15 тысяч жыхароў. Ішлі работы па ўзвядзенні асноўных аб'ектаў АЦЭЦ, у тым ліку быў выкапаны паўнамерны катлаван, забіты палі, пачалося бетанаванне днішча ядзернага рэактара, быў закладзены падмурак аднаго з асноўных аб'ектаў АЦЭЦ — спецыяльнага механічнага корпуса, дзе павінна было захоўвацца і падрыхтоўвацца да выкарыстання ядзернае паліва, а таксама праводзіцца ачыстка дэталяў першага контуру; узводзіліся таксама іншыя аб'екты... Шчыра прызнацца, шкада ўсяго таго, што было ўжо зроблена. Як вядома, у рэспубліцы пасля чарнобыльскай аварыі адразу ж адмовіліся ад гэтага аб'екта (надоўга адмовіліся ад атамнай энергетыкі ўвогуле), і на яго месцы пабудавана звычайная цеплавая станцыя ЦЭЦ-5. Яе, між іншым, узвялі па ініцыятыве і сіламі нашай жа арганізацыі, «Белэнергабуда».

Аднак што было, тое прайшло. А прыгадаў я гэта з тым, каб засяродзіць увагу: калектыў «Белэнергабуда», яго спецыялісты былі здольныя пабудаваць гэту АЦЭЦ. І пабудавалі б яе ў запланаваны тэрмін, каб не той жа Чарнобыль.

Пра ранейшыя магчымасці «Белэнергабуда» таксама добра сведчаць такія лічбы: за 1985—91 гады мы ўвялі адзін мільён мегават энергамагутнасцяў, за 1991—99 гады — 1,5 мільёна МВт. Намі было прыкладзена нямала намаганняў, каб выйграць конкурс на будаўніцтва Калінінградскай ЦЭЦ. І, дарэчы, пабудавана першая чарга ЦЭЦ разам з энергаблокам усяго за два гады і 8 месяцаў, а гэта вельмі сціслы тэрмін. І ўсё зроблена з добрай якасцю. Спецыялісты «Белэнергабуда» ўдзельнічалі ў будаўніцтве многіх атамных станцый на тэрыторыі былога Саюза, а таксама ў будаўніцтве АЭС у іншых краінах, нямала хто з іх і цяпер працуе на замежную атамную энергетыку.

Аднак ці мае «Белэнергабуд» такі ж добры патэнцыял цяпер, ці здольны ён пабудаваць тую ж АЭС — па сутнасці, так было пастаўлена пытанне. У сувязі з гэтым варта прызнаць: часам можна сустрэць даволі стрыманую ацэнку цяперашніх магчымасцяў «Белэнергабуда». І, безумоўна, ёсць на тое пэўныя прычыны. Напрыклад, раней ён меў у сваім складзе звыш 8 тысяч спецыялістаў, цяпер жа — трохі больш за 2500. А будаўніцтва АЭС — гэта надзвычай сур'ёзная справа. Няхай не крыўдуюць на мяне іншыя будаўнікі, іншыя спецыялісты, але гэта далёка не тое, што, напрыклад, узвесці нават Нацыянальную бібліятэку, хоць яна і атрымалася вельмі добрай, або ўзвесці іншыя прамыслова-грамадзянскія аб'екты. Каб пабудаваць АЭС, трэба прыцягнуць масу людзей, спецыялістаў (гл. схему). Скажам, на будаўніцтве Смаленскай АЭС у Расіі было задзейнічана да 13—18 тысяч чалавек... Такім чынам, ці здольныя?

Лічу, па-першае, што менавіта сама Беларусь і павінна будаваць сваю атамную станцыю, а не замежныя спецыялісты, якія выказваюць да гэтай справы надзвычай актыўную зацікаўленасць. А, па-другое, вядома ж, і зможа, і павінен удзельнічаць у гэтым будаўніцтве непасрэдна «Белэнергабуд» са сваімі субпадраднымі арганізацыямі ў Рэспубліцы Беларусь. Не будзем забываць пра тое, што «Белэнергабуд» гэта — спецыялізаваная арганізацыя па ўзвядзенні маштабных энергааб'ектаў (у Беларусі ўсе электрастанцыі былі пабудаваны менавіта «Белэнергабудам»), яго спецыялісты маюць багаты адпаведны вопыт; гэты іх вопыт і ўменне, як адзначана ўжо, у поўнай меры былі выкарыстаны (і выкарыстоўваюцца) замежнымі заказчыкамі.

Але ж вышэй узгадвалася таксама пра цяперашні даволі сціплы колькасны склад «Белэнергабуда»... Скажу тут так: пра крыху аслабленага чалавека нярэдка так мяркуюць — былі б у яго цэлыя і моцныя косці, а ўсё астатняе нарасце. Дык вось, нягледзячы на тыя ж колькасныя страты, на страты сваёй агульнай «масы», «Белэнергабуд» тым не меней захаваў добры і моцны касцяк. І мы ўжо вельмі хутка зможам аднавіць, сфарміраваць паўнакроўны калектыў, які ўзяў бы на сябе асноўны цяжар работы. Менавіта асноўны. Бо тое ж будаўніцтва АЭС патрабуе, каб на ім былі задзейнічаны спецыялісты многіх міністэрстваў і ведамстваў, да яго трэба прыцягнуць многія будаўнічыя і мантажна-будаўнічыя, спецыялізаваныя арганізацыі (гл. схему). Далей: многія нашы былыя спецыялісты, у тым ліку вядучыя, якія ў свой час былі накіраваны ад нас на будаўніцтва станцый у Расіі і ў іншых краінах, калі даведаліся пра будаўніцтва АЭС у Беларусі, самі ж выказаліся прыняць у ім удзел. Гэта, напрыклад, Стасюк А.А., які працуе цяпер на іранскай АЭС у горадзе Бушэры намеснікам кіраўніка дырэкцыі, Андрыянаў А.А. (ён таксама ў Бушэры), Жылінскі А.Е., які быў начальнікам будаўніцтва Мінскай АЦЭЦ, і многія іншыя. Увогуле, ужо звыш 1,5 тысячы чалавек пагадзіліся ўдзельнічаць у будаўніцтве. Словам, мы можам вярнуць гэтых спецыялістаў «з барадой і вопытам» зноў да сябе. Тым болей, многія з іх проста пупавінай прывязаны да нашай зямлі, а цяпер вымушаны знаходзіцца ў доўгатэрміновых замежных камандзіроўках.

Іншая справа: якія ўмовы будуць прапанаваны для ўсіх гэтых людзей, якая ў іх будзе заработная плата. У дадзеным выпадку трэба арыентавацца на заработную плату будаўнікоў АЭС у Расіі, у якой пераважна і знаходзяцца нашы былыя спецыялісты. Так, там заработная плата значна вышэйшая, і адпаведныя выдаткі будуць большыя. Але варта мець на ўвазе: калі мы запросім будаваць замежных спецыялістаў, яны возьмуць, у цэлым, намнога болей. У прыватнасці, калі будаўніцтва нашай АЭС, толькі пры ўвядзенні яе першай чаргі, па нашых унутраных каштарысах, ацэньваецца ў суму каля 5—6 мільярдаў долараў, то замежныя фірмы возьмуць не менш чым 7—9 мільярдаў.

Хацеў бы тут таксама дадаць: будаваць АЭС нам трэба толькі разам з Расіяй. Па-першае, добра адаптаваны нашы энергасістэмы. А па-другое, абсталяванне для АЭС, якое вырабляецца ў Расіі, сёння лічыцца ў свеце адным з лепшых. На карысць расійскага абсталявання добра сведчыць надзейная работа ўзведзенай ужо немалы час таму фінскай атамнай станцыі ў горадзе Лавіза, на якой, зразумела, гэта абсталяванне задзейнічана.

***— У якім стане цяпер падрыхтоўчыя работы па будаўніцтве АЭС, што трэба зрабіць сёлета?***

— Найперш трэба паскорыць стварэнне адпаведнай прававой базы, у прыватнасці, прыняць Закон аб выкарыстанні атамнай энергіі, Праграму развіцця атамнай энергетыкі краіны, Агульныя палажэнні забеспячэння бяспекі атамных станцый пры іх праектаванні, будаўніцтве і эксплуатацыі і некаторыя іншыя дакументы. Трэба таксама паскорыць распрацоўку тэхніка-эканамічнага абгрунтавання будаўніцтва, правесці тэндар. Трэба нарэшце, і хутчэй за ўсё, зрабіць канчатковы выбар пляцоўкі для будаўніцтва АЭС. Для паскарэння ж узвядзення самой АЭС варта было б пры праектаванні ўзяць за аснову праект прамысловай базы і гарадскога пасёлка Мінскай АЦЭЦ і падкарэктаваць яго нашымі ж праекціроўшчыкамі пад цяперашняе будаўніцтва. Гэта дало б магчымасць пачаць будаваць жылы пасёлак (наяўнасць жылля — гэта, нароўні з заработнай платай, другая найважнейшая ўмова прыцягнення сюды спецыялістаў) і прамысловую базу адразу пасля выбару пляцоўкі, а адпаведна — зэканоміць вялікія сродкі і час.

***— Міхаіл Паўлавіч, абгрунтоўваючы неабходнасць развіцця атамнай энергетыкі, мы нярэдка гаворым пра непазбежнае вычэрпванне запасаў арганічнага паліва на Зямлі. Але ці не сутыкнёмся і з дэфіцытам таго ж урану, з якога і атрымліваюць ядзернае паліва?***

— Урану хопіць на мноства гадоў. Уран знаходзіцца на Зямлі паўсюдна. Гэты элемент распаўсюджаны прыкладна гэтак жа, як волава або цынк, ён уваходзіць у склад многіх парод. Яго канцэнтрацыя ў горных пародах складае 0,0002—0,0004 працэнта, а ў морах і акіянах — 0,00013. Такім чынам, пры распрацоўцы эканамічных тэхналогій атрымання ўрану з гэтых парод (а гэта даступна сучаснай сусветнай навуцы) рэсурсы паліва для АЭС могуць быць практычна невычарпальнымі. А на бліжэйшыя 30—50 гадоў у зямлян хопіць ужо здабытага ўрану. Прычым у свеце штогод здабываецца і выпрацоўваецца больш за 40 тысяч тон урану, які прыдатны для работы на АЭС.

Пры гэтым, можна спадзявацца, хутка з'явіцца ў свеце і першы ядзерны рэактар з кіруемым тэрмаядзерным сінтэзам. І ў дадзеным выпадку мы таксама будзем мець практычна неабмежаваныя запасы паліва — гэта вада акіянаў і мораў, з якой выдзяляюцца лёгкія ізатопы вадароду, што потым і ўдзельнічаюць у тэрмаядзернай рэакцыі. Прычым, варта асабліва адзначыць, тэрмаядзерны сінтэз вызначаецца практычна поўнай адсутнасцю радыеактыўных адходаў. І яшчэ: на адзінку масы тэрмаядзернага паліва энергіі ўтвараецца ў 100 разоў болей, чым пры расшчапленні ядраў урану, і ў дзесяткі мільёнаў разоў болей, чым пры згаранні арганічнага паліва.

Такім чынам, прагрэс, сусвет у сваім развіцці крочаць далей наперад. Па некаторых прыкідках, да 2050 года каля 50 працэнтаў усёй энергіі ў свеце будзе выпрацоўвацца менавіта на атамных станцыях.

**ДЛЯ ДАВЕДКІ.** ***У свеце цяпер працуюць 435 ядзерных рэактараў, яшчэ некалькі дзесяткаў іх узводзяцца. Найбольшую колькасць дзеючых рэактараў маюць ЗША (103), Францыя (59), Японія (55), Расія (31). АЭС забяспечваюць наступныя патрэбнасці асобных краін у электраэнергіі — на 78 працэнтаў у Францыі, на 54 — у Бельгіі, на 39 — у Паўднёвай Карэі, на 37 — у Швейцарыі, на 30 працэнтаў — у Японіі. Сёння ў свеце на атамных станцыях выпрацоўваецца каля 15 працэнтаў усёй электрычнай энергіі.***

**Іван БАРАНОЎСКІ.**

**НА ЗДЫМКАХ:**

- *Міхаіл Паўлавіч КАНДРАЦЬЕЎ.*
- *«Белэнергабуд» удзельнічаў у будаўніцтве Смаленскай АЭС, Калінінскай АЭС і іншых атамных станцый у Расіі і ў іншых краінах.*
- *У «Белэнергабудзе» падкрэсліваюць: для будаўніцтва АЭС трэба прыцягнуць многія арганізацыі і ведамствы. Вось такімі сіламі будавалі Мінскую АЦЭЦ.*
- *З сучасных пейзажаў Японіі. На заднім плане — АЭС.*

Заснавальнікі — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» і грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Рэгістрацыйны № 12.



ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

САКАВІКА
2008 г.
ПЯТНІЦА
№ 13 (15517)

Лідарскі дар

# З дырыжораў — у арганізатары

## У пачатку сваёй кар'еры маладому кіраўніку даводзілася працаваць задарма

**Энергічныя маладыя людзі могуць горы звярнуць, пра адну такую горку мы зараз вам і раскажам. Знаёмства з новым героем нашай пастаяннай рубрыкі пра маладых кіраўнікоў пачынаецца з яго офіса — дзівакаватыя формы, сакавітыя колеры (жоўты, аранжавы, салатавы), задорная фонавая музыка. Гэткі антураж выдае ўладальніка з галавой — вясёлы, арыгінальны, з агеньчыкам. Першае ўражанне пацвердзілася і далейшай размовай: ён сапраўды такі — прыязны, гумарны і вельмі энергічны, гамяльчанін Сяргей Гунь — кіраўнік праекта «Выпускнік» (vypusknik.by). За плячыма ў Сяргея — 26 пражытых гадоў, адыграныя гульні КВЗ і не адзін перавыхаваны за адну толькі змену ў лагеры атрад маленькіх жэўжыкаў, духавое аддзяленне сталічнага ўніверсітэта культуры і магістратура эканамічнага факультэта БДУ, а наперадзе яшчэ больш — дзесяткі смелых задум, сотні няходжаных сцежак і тысячы людзей, чый адпачынак стане яго працай.**



*Сяргей ГУНЬ (у цэнтры) з сябрамі па камандзе КВЗ «Cosa nostra».*

### БАГАЖ ЛІДАРА

Лідарскія здольнасці ў Сяргея — са школы: масавіку-зацейніку даводзілася браць на сябе многія абавязкі — ад выбару падарункаў дзяўчатам на веснавое свята да арганізацыі школьных вечарын. Музычныя здольнасці яму ў гэтым вельмі дапамагалі. Пасля школы доўга вызначацца з выбарам прафесіі Сяргею не давялося.

— Я граў на саксафоне, на гітары — калі пад руку трапляласа ў паходзе, так, дваравыя песні паспяваць, на фано паімправізаваць мог.

Музычная сцежка прывяла яго спачатку ў Гомельскі каледж мастацтваў, а пасля і ва ўніверсітэт культуры. Там лідару прыйшлася даспадобы гульня ў КВЗ.

— Жарты жартамі, аднак акрамя іх ёсць і нейкія адміністрацыйныя нюансы: дамовы пра выступленні, гастролі ў іншых гарадах, калі трэба вырашаць пытанні з пражываннем, харчаваннем. Хтосьці павінен займацца і гэтым, у нашай камандзе такім чалавекам быў я. І неяк незаўважна для самога сябе стаў дырэктарам каманды КВЗ «Cosa nostra». Гэта была цудоўная школа арганізатарства, я і не здагадваўся, наколькі карысным стане для мяне такі вопыт.

Прынамсі, КВЗ-шны карабель пад кіраўніцтвам Сяргея не толькі трымаўся на плаву, але і не раз лідзіраваў у рэгаце: каманда «Cosa nostra» станавілася чэмпіёнам Вышэйшай лігі беларускага КВЗ і «Еўралігі».

Аднак самую істотную лепту ў скарбонку лідарства дадала, відаць, праца з дзецьмі — важатым у лагеры, куды студэнт Гунь выпраўляўся кожнае лета. Дзеці яго літаральна абажалі і гэта ў іх, відаць, было ўзаемна — пра тыя залатыя дзянькі Сяргей можа расказваць безупынку:

— Я і сам у дзяцінстве кожнае лета праводзіў у піянерскім лагеры і ведаю, як зрабіць, каб дзецям было весела — прывозіў з сабой горн, каб стварыць асаблівую атмасферу, гэткі дух летняга лагера, мы з маімі выхаванцамі разам лазілі па гарах, хадзілі ў паходы — з вогнішчамі і спевамі пад гітару, усё як трэба. Нават сёлета вырваўся на некалькі тыдняў — з дзецьмі мне працаваць у радасць, хоць гэта і цяжка — цэлая арава, якая ўвесь час у руху, заўсёды нешта задумвае, але ж ад іх столькі бадзёрасці, энергіі!

Пасля Сяргеевых баек стала зразумела, што такі важаты, як ён, — мара любога малога гарэзы: ён умее так усё арганізаваць, што дзеці проста млеюць. Дзеля гэтага, праўда, часам даводзіцца пускацца на хітрыкі. Аднойчы, напрыклад, ён аб'явіў свайму атраду, што сёння ноччу яны ўпотай выберуцца з лагера і пойдуць на дыскатэку. Зразумела, папярэдне важаты дамовіўся аб усім з дырэктарам лагера, напісаў заяву з просьбай адпусціць з ім дзяцей на азначаны час, аднак ім аб гэтым ведаць было не абавязкова: куды цікавей выбірацца праз вокны, кароткімі перабежкамі перасоўвацца да плота, а пасля цераз яго пералазіць. Гэта ж такая авантура, сапраўдныя прыгоды — уцёкі з важатым!

Нядзіўна, што калі студэнцкая пара блізілася да заканчэння, падрыхтоўкай выпускнога балю займаўся ініцыятыўны Сяргей Гунь.

— Я сам духавік і ў групе нашай адны хлопцы — перспектыва такога выпускнога, зразумела, не радавала, асабліва калі прыгадаць, што на нашым патоку ёсць сімпатычныя эстрадніцы, народніцы, харавічкі! Пагутарылі з імі, назбіралася чалавек 50, але ж і гэтага для класнай вечарыны мала. Карацей, вырашылі аб'яднаць увесь універсітэт. Запрасілі рэктара, дэканаў, многіх выкладчыкаў. Свята атрымалася на славу!

Арганізаваўшы ўласны выпускны баль, Сяргей задумаўся, што няблага было б ладзіць такія святы для ўсіх ахвотных выпускнікоў. Неўзабаве праз два гады ён разам з сябрамі — Андрэем Лебедзевым і Дзмітрыем Тушынскім — зарэгістраваў уласнае прадпрыемства «Трое» і ўзначаліў праект «Выпускнік». Аднак самым першым арганізаваным выпускным лічыць усё ж уласны — вось так нараспечаны дырыжор аркестра ператварыўся ў арганізатара маштабных выпускных.

### ВЫПУСКНЫ «ПАД КЛЮЧ»

— Наш праект у «нішы» выпускных — адзіны, — кажа малады кіраўнік, — іншыя агенцтвы займаюцца пераважна карпаратывамі, прычым часцей за ўсё выключна праграмай гэтых святаў. Мы ж прапануем маладым людзям выпускны прыкладна на 300 чалавек «пад ключ»: пачынаючы з арэнды залы і заканчваючы забаўляльнымі мерапрыемствамі. Усё вытрымана ў цікавай, своеасаблівай манеры а-ля галівудскія фільмы: картэж з лімузінаў, чырвоная дывановая дарожка, запрошаныя зоркі эстрады, феерверк, конкурсы, сюрпрызы, кожны нумар у нашым шоў падаецца незвычайна — там асаблівая атмасфера, яе не перадаць словамі, гэта трэба адчуць на сабе! Шоў здымаецца таксама схаванай камерай — так што непастановачных сюжэтаў з удзелам нашых выпускнікоў будзе даволі! Сцэнарый штогод удасканальваецца, свята атрымліваецца ўсё больш чароўным, вясёлым і незабыўным. Усіх сакрэтаў выдаваць не буду, скажу толькі, што сёлета мы праводзім сярод выпускнікоў конкурс дызайнераў, фатографаў і відэааператараў.

Таленавітыя дзяўчаты і хлопцы змогуць прэзентаваць сябе (іх працы будуць прадэманстраваны падчас выпускнога), атрымаць прызы і шанц працаўладкавацца — планы ў Сяргея Гуня глабальныя, ёсць ідэі наконт новых накірункаў, дзе крэатыўная моладзь будзе вельмі патрэбнай.

І яшчэ адзін немалаважны для студэнтаў момант — цана выпускнога:

— Мы арганізоўваем не адзін выпускны, а цэлую серыю, таму маем даволі істотны бюджэт. Пагадзіцеся, адна ўніверсітэцкая група наўрад ці здолее аплаціць выступленне вядомага музычнага гурта ці той жа феерверк, а на нашых выпускных такіх прыемнасцяў будзе шмат. Да таго ж, нашы заказы звычайна аптовыя, а опт — натуральна, больш танны, таму мы можам прапанаваць насычаны забавамі выпускны з відэаздыманнем па тым жа кошце, па якім абыдзецца толькі вячэра ў рэстаране, калі арганізацыяй студэнты будуць займацца самі.

### МОЛАДА, А ЦІ ЗЕЛЕНА?

Кіраўнік, на думку Сяргея, — гэта палкаводзец: той, хто бачыць усё поле бою, кантралюе працэс цалкам, а не асобныя этапы, бачыць схему, парушэнні ў ёй і імгненна іх выпраўляе. І на сваіх выпускных, пакуль усе весяляцца, ён працуе — сочыць за ўсім:

— Для мяне гэта свята — вялізны шматдэтальны механізм, дзе кожная дробязь павінна быць на сваім месцы, і калі нешта раптам пайшло не так, трэба імгненна даць указанні аб тым, што і каму рабіць: у кожнага падраздзялення ёсць рацыя, таму мы звязваемся і вырашаем усе праблемы аператыўна.

Сярод мінусаў кожнага маладога кіраўніка Сяргей Гунь назваў нявопытнасць, «аднак гэта з часам прыходзіць», — тут жа дадаў ён і пераключыўся на плюсы: «энергія цераз край, апантанасць, энтузіязм, навізна ідэй».

— Кіраўніку патрэбны камунікабельнасць, мэтанакіраванасць, настойлівасць, упартасць, варта развіваць у сабе арганізатарскія здольнасці, адчуваць працэс, як што трэба рабіць, знаходзіць падыходы да розных людзей, — кажа Сяргей. — Зразумела, сталыя людзі, да нас, маладых, часам ставяцца скептычна. Аднак яны разумеюць таксама, што без найноўшых тэхналогій сёння нікуды, а да іх якраз больш успрыімлівыя менавіта маладыя людзі. І хоць у прынцыпе ставяцца станоўча, на падсвядомым узроўні ўсё ж успрымаюць як «зелень» — часта недаацэньваюць нас, не думаюць аб тым, што з нашай фантазіяй і энтузіязмам мы часта можам прапанаваць куды больш, чым яны могуць прыдумаць. Тут дапамогуць толькі настойлівасць і няспынная праца — маму ж з татам не прывядзеш замест сябе! Не менш важна не толькі дзейнічаць, але і выглядаць адпаведна абставінам — на мерапрыемствах, якія патрабуюць афіцыёзу, гальштук не пашкодзіць: хоць за ім не схаваеш узросту, аднак выглядаць будзеш да месца.

І яшчэ адна важная парада ад нашага маладога лідара — у тым, як заваяваць рэпутацыю: «трэба шмат працаваць, прычым на пачатку за проста так, на сваіх першых выпускных мы самі нічога не зарабілі — проста патрацілі грошы выпускнікоў на праграму, меню і гэтак далей, а самі набылі... вопыт, што для пачаткоўцаў даражэй за грошы! Да таго ж, напрацавалі нешта накшталт партфоліо, каб было што прапанаваць наступным выпускнікам, тады і зарэгістраваліся юрыдычна».

Сяргей падзяліўся з намі і вопытам кіравання персаналам:

— У мяне пакуль невялікая каманда — усяго шэсць чалавек, стыль стасункаў з імі — дэмакратычны з элементамі аўтарытарнага: стараюся быць лаяльным, аднак бываюць сітуацыі, калі і стукнуць кулаком па стале не пашкодзіць. Да кожнага супрацоўніка трэба падабраць свой ключык. Вось напрыклад, наш дызайнер Максім — вельмі крэатыўны, таленавіты хлопец, у яго цікавыя ідэі, працуе здорава, аднак лайдак невыносны, калі не падсцёгваць, нічога з яго не будзе. Зразумела, індывідуалізаваны падыход патрабуе дадатковых сілаў і энергіі, аднак і вынік дае больш істотны.

### ЦІ ТОЕ ЯШЧЭ БУДЗЕ!

— Акрамя арганізацыі выпускных баляў і карпаратыўных вечарын мы яшчэ рыхтуем прэзентацыйныя фільмы для кампаній (на ўласнай відэастудыі), аднак гэта яшчэ толькі пачатак. У самых блізкіх планах «Трое» — адчыніць фота- і дызайн-студыю: будзем шыць святочнае ўбранне (для тых жа выпускных) і не толькі: эксклюзіўнае адзенне ў моладзі заўсёды запатрабавана. У нас ужо ёсць свой мадэльер — Алена Ярашэўская, сёлета яна, прынамсі, удзельнічае ў фестывалі «Млын моды», так што першая калекцыя амаль падрыхтавана. У далейшым плануем арганізоўваць і вяселлі — таксама эксклюзіўныя: стылістычна вытрыманыя, нестандартныя. Прапановы па арганізацыі вяселля, зноў жа, вельмі актуальныя для выпускнікоў. Зразумела, будзе выразная дыферэнцыяцыя: адны займаюцца выпускнымі, другія вяселлямі, трэція — дызайнам адзення, тады гэта будзе якасна, на належным узроўні.

Ну вось мы і пазнаёмілі вас, чытачы, з яшчэ адным маладым кіраўніком — здольным і энергічным. Ён сваю гару пакрысе зварочвае, і нам з вамі варта зварухнуць хоць бы маленькія каменьчыкі. Хто ж, як не мы — маладыя і перспектыўныя?!

**Ала МАЧАЛАВА.**

***Фота з асабістага архіва Сяргея ГУНЯ.***

П'едэстал

# Падрастае канкурэнт ІВАНУ ЦІХАНУ

**20-гадовага кідальніка молата Юрыя Шаюнова называюць галоўнай надзеяй Беларусі на летніх Алімпійскіх гульнях-2012 у Лондане. Вялікі патэнцыял мінчаніна даказваюць яго вынікі на маладзёжных турнірах: летась лёгкаатлет выйграў маладзёжны чэмпіянат Еўропы, а нядаўна стаў і ўладальнікам Кубка Еўропы. Цікава, што сям'я Шаюновых па-сапраўднаму спартыўная — лёгкаатлетычная. Мама спецыялізавалася на дыску, а цяпер працуе настаўніцай фізкультуры ў школе. Яе дзеці — малатабойцы, а трэніруе іх бацька, Віктар Міхайлавіч (у мінулым таксама малатабоец). Аднак галава сямейства прызнаецца, што вучыць сваіх дзяцей цяжэй, чым чужых, бо бачыш, што яны робяць пасля трэніроўкі, ці сочаць за рэжымам.**



Фота Вольгі ЛАСКІ.

Віктар Міхайлавіч не планаваў, што яго сын стане кідальнікам молата. «Юра быў хлопчыкам паўнаватым, — тлумачыць бацька, — вось я і браў яго з сабой на трэніроўкі, каб сын займаўся фізкультурай, дужэў. Зразумела, у дзяцінстве молат я яму кідаць не дазваляў, а даваў толькі балванку з тросікам. Сур'ёзна ж працаваць з молатам Юра пачаў з сёмага класа». Бацька ганарыцца дасягненнямі свайго сына, хоць на трэніроўках Юра для яго роўны з усімі астатнімі выхаванцамі. «Сын вельмі мэтанакіраваны, цярплівы, — кажа Віктар Міхайлавіч. — Праўда, прадказаць, калі ён дагоніць дарослых спартсменаў, цяжка. Пакуль Юра толькі падбіраецца да нашай эліты, кідае молат амаль на 75 метраў (для параўнання — у сваёй лепшай спробе на чэмпіянаце свету ў Осацы сярэбраны прызёр Алімпіяды-2004 Іван Ціхан адправіў снарад за 83 метры). Высокія вынікі ў малатабойцаў звычайна пачынаюцца пасля 20 гадоў». Цікава, што сястра Юры ў каардынацыйным і хуткасным плане схапіла рух раней за брата, таму і стала раней паказваць добрыя вынікі (Наталля — бронзавы прызёр ЧЕ сярод юніёраў).

Спартыўным балельшчыкам, пэўна, цікава, ці цяжка хлопцу будзе пераходзіць з маладзёжнага спорту ў дарослы? Яго трэнер супакоіў, што ў гэтым праблем практычна няма: «Юра цяпер кідае такі ж снарад, як і дарослыя атлеты (ён важыць 7 кілаграмаў 260 грамаў). Акрамя таго, на чэмпіянаце Беларусі моладзь спаборнічае з дарослымі».

Юру Шаюнова я знайшла на стадыёне ля Мінскага медуніверсітэта, дзе звычайна трэніруецца юнак. Я павіншавала хлопца з перамогай на Кубку Еўропы і стала распытваць, як ён трэніруецца пад такім снегападам на вуліцы.

— А што? Апранаеш тры касцюмы, шарсцяныя шкарпэткі. Праўда, у такой форме выглядаеш у сектары, як ватнае медзведзяня, але так цяплей. Даводзіцца пасыпаць пляцоўку соллю, каб не слізгала.

***— Юра, у цябе як мінчаніна была добрая магчымасць займацца папулярнымі ў балельшчыкаў футболам ці хакеем, а ты выбраў кіданне молата. Скажы шчыра, гэта бацька прымусіў?***

— Я сам захацеў. У футбол я спрабаваў адабрацца ў трэцім класе, нешта не атрымалася. Шчыра кажучы, я не шкадую, што не пайшоў у гульню № 1, бо мне падабаюцца індывідуальныя віды спорту, дзе ўсё залежыць толькі ад цябе аднаго. А ў футболе 11 ігракоў бегаюць па полі, выкладваюцца па поўнай, а варатар прапускае гол і каманда прайграе. А ў кіданні молата, як я выступлю, такі вынік і будзе. Дарэчы, у футбол я магу пагуляць у двары з сябрамі. Звычайна я варатар, бо з маёй камплекцыяй цяжка бегаць з мячом, затое я яго добра выкідваю рукой: мяч вельмі далёка ляціць.

***— У Мінску праводзіцца чэмпіянат па кіданню мабільных тэлефонаў. Ты мог бы ўзяць у ім удзел і адправіць мабільнік на вялікую адлегласць?***

— Я сваю сілу па жыцці не выкарыстоўваю. Мабыць, толькі, калі дапамагаю бацькам насіць цяжкія рэчы. А ў кіданні мабільнікаў лепей сябе паказалі б кідальнікі дыска ці кап'я. Яны каменьчык за 100 метраў закінуць. Я ж у школе мячык толькі на 36 метраў адпраўляў. Горш за ўсіх, бо маёй руцэ не хапае хвосткасці.

***— Амаль у кожнага малатабойца перад кіданнем існуе свой рытуал. Напрыклад, наш зямляк Вадзім Дзевятоўскі нават размаўляе са сваім снарадам. Якія прафесійныя сакрэты ў цябе?***

— Для мяне галоўнае — псіхалагічна падрыхтавацца. Перад выступленнем перакрыжоўвацца ці размаўляць з молатам звычкі ў мяне няма. Аднак я ведаю, што некаторыя спартсмены нават звяртаюцца да продкаў, каб набыць упэўненасць. Хтосьці робіць ажно сем размахаў, каб сканцэнтравацца. Для гэтага патрэбна вялікая сіла, бо звычайна ж робяць два-тры размахі, а на наступны раз ідзе ў ход молат.

***— Ці сочыш за спартсменамі, якія знаходзяцца ў сектары, у час спаборніцтваў?***

— На гэта не трэба глядзець, таму што гэта збівае псіхалагічны настрой. Лепей сканцэнтравацца на сабе, бо ў першую чаргу табе ж трэба пабіць свой асабісты вынік, а перамагчы сябе — самае складанае.

***— Ведаеш, як настроіцца на апошнюю спробу ў сектары, якая можа вырашыць увесь расклад?***

— Калі ты змагаешся за выхад у фінал, то патрэбна сказаць сабе: «Сабярыся, ануча. Гэта ж твой шанц». А вось, калі ты лідар, гэта расслабляе, таму цябе могуць перакінуць сапернікі. Болей у такой сітуацыі, пэўна, трэнер хвалюецца. Ведаю, што некаторыя настаўнікі валідол п'юць, калі іх выхаванец кідае молат.

***— Як сам лічыш, пасля пераходу ў дарослы спорт ты здолееш канкурыраваць з Іванам Ціханам?***

— Мне да яго яшчэ расці і расці. А для гэтага патрэбна шмат трэніравацца. У Беларусі наогул вялікая канкурэнцыя паміж малатабойцамі, бо ў нас ажно чатыры спартсмены маюць вынік за 80 метраў, а ў некаторых краінах 78 метраў — ужо прыкмета лідарства. На Кубку Амерыкі лепшае дасягненне — 75 метраў, а ў нас на такі вынік скажуць: «Трэніруйся яшчэ». Дарэчы, калі мой бацька кідаў за 73 метры — гэта было для таго часу, як цяпер 84 метры. З тым вынікам бацька быў другім у Саюзе, што шмат значыць, бо гэта не першынство Беларусі, а спаборніцтва 15 рэспублік СССР.

***— Спартсменаў часам ловяць на выкарыстанні допінгу. Як да гэтага ставішся?***

— Я ведаю, што допінг могуць падмяшаць у ежу, асабліва ў ваду. На спаборніцтвах звычайна шведскі стол. Калі ты не давяраеш сваім суседзям, лепей заўжды сачыць за сваёй талеркай, каб яна была на віду. Ваду патрэбна браць з не адкрытай бутэлькі. Ва ўсім патрэбна быць асцярожным.

***— Які твой рэцэпт адпачынку ад сілавой нагрузкі?***

— Калі я трэніруюся ў «Стайках», можна па лесе пагуляць. У горадзе я не аматар дыскатэк, лепей аддам перавагу камп'ютарным гульням. Люблю глядзець КВЗ і мульцікі, асабліва «Ледавіковы перыяд» і «Ілля Мурамец і Салавей-разбойнік». Мульцікі мне падабаюцца, бо ў іх нармальны гумар, які можна выкарыстоўваць па жыцці. Навошта быць сумным?

***— Ты зараз вучышся на трэнера. Бярэш прыклад з бацькі?***

— Так атрымалася, што сям'я ў нас спартыўная. Маці — выкладчык фізкультуры, калісьці была кідальніцай дыска. Бацька — трэнер па кіданні молата. Гледзячы на яго, я разумею, якая гэта цяжкая праца, бо патрэбна мець вельмі вялікае цярпенне.

***— Ці будзеш сачыць за малатабойцамі на Алімпіядзе ў Пекіне?***

— Безумоўна! Па двух прычынах: мне гэта цікава асабіста, і абавязкова патрэбна ведаць. У нашым педуніверсітэце ёсць прадмет «Гісторыя фізічнай культуры», дзе адно з пытанняў якраз гісторыя Алімпійскіх гульняў — ад Грэцыі да сённяшняга часу. Калі мяне спытаюць, хто заваяваў «золата» ў Пекіне, хацелася б назваць імя беларуса. Наогул я сам вельмі мару ўвайсці ў гісторыю Алімпіяд.

***— Дзякуй за гутарку! Жадаю, каб твая мара ажыццявілася і не адзін раз.***

**Ірына ПРЫМАК.**

# ВЫБІРАЕМ ГУЛЯЮЧЫ,
## ці Моладзь супраць фармалізму

*Мікулка — самы дэмакратычна выбраны сакратар у рэспубліцы*

**Усе разумеюць, што ў маладзёжных арганізацыях не павінна быць выпадковых людзей. Але, тым не менш, без вялікай ахвоты ідуць на чарговыя выбары і галасуюць за людзей, якіх, бывае і так, першы раз бачаць. Грамадская арганізацыя «БРСМ» Белдзяржуніверсітэта зрабіла першы крок убок ад фармалізму.**

На працягу двух дзён на базе САК «Брыганціна» ішла напружаная барацьба паміж шасцю кандыдатамі на пасаду сакратара БРСМ БДУ. Упершыню за ўсю гісторыю арганізацыі выбары праходзілі ў нестандартнай форме — дзелавой грамадска-адукацыйнай ролевай гульні «Твой выбар». Кожны кандыдат меў свой перадвыбарны штаб з сакратарамі па сувязях з грамадскасцю, па развіцці карпаратыўнай культуры штаба, па фарміраванні станоўчага іміджу кандыдата, а таксама па праектнай дзейнасці кандыдата. Кожны з прэтэндэнтаў даказваў свае лідарскія здольнасці ў час прэзентацыі асабістай праграмы, у ходзе прэс-канферэнцыі, дэбатаў з канкурэнтамі, у межах «круглага стала». Кожнаму была дадзена магчымасць паказаць сябе з розных бакоў: сур'ёзным дакладчыкам, выступаючы перад выбаршчыкамі, крэатыўным чалавекам, прымаючы ўдзел у творчым вечары «Права голасу», а таксама выдатным арганізатарам, дэманструючы зладжаную работу штаба.

Інфармацыйную падтрымку ў выглядзе майстар-класаў патэнцыяльным сакратарам аказалі дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Ігар Карпенка, сакратар ЦК ГА «БРСМ» Максім Борда.

Найбольшую сімпатыю выбаршчыкаў заваяваў Дзміры Мікулка, студэнт 5-га курса геаграфічнага факультэта. У школе быў актывістам. Ва ўніверсітэце актыўна займацца грамадскай дзейнасцю пачаў напрыканцы другога курса. Тады яго шлях упершыню перакрыжаваўся з маладзёжнай арганізацыяй «БРСМ»: летам працаваў у будаўнічым атрадзе на Аўгустоўскім канале. Праз паўгода яго выбралі сакратаром БРСМ геаграфічнага факультэта.

Я пазнаёмілася з Дзімам у мінулым годзе на курсах маладога лідара, якія арганізоўвала Акадэмія Кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, дзе ён якраз і прадстаўляў ГА «БРСМ» БДУ. І вось неўзабаве даведваюся, што амаль у шасцітысячнай грамадскай арганізацыі БРСМ БДУ з'явіўся новы кіраўнік. І хто б вы думалі — Дзмітрый Мікулка.

— У мяне за два дні перад выбарамі быў дзяржаўны экзамен, таму я апошні тыдзень недасыпаў, — расказвае Дзіма. — На працягу ролевай гульні таксама спаць не давялося. Усе рыхтаваліся да прэс-канферэнцыі, нешта прыдумвалі, рэпетавалі творчыя нумары. У працэсе гульні я ў чарговы раз пераканаўся, што зрабіў правільны выбар. Адчуваю сябе на сваім месцы. У мяне шмат ідэй, задумак наконт далейшага развіцця маладзёжнай арганізацыі. Самая цікавая, на мой погляд, спроба звязаць БРСМ з бізнэсам. Нават у статуце арганізацыі прапісана, што маладзёжная арганізацыя можа займацца прадпрымальніцкай дзейнасцю пры ўмове, што атрыманы прыбытак будзе накіраваны на развіццё арганізацыі. Можна заснаваць на базе БРСМ універсітэта капіравальны цэнтр ці цэнтр па рэалізацыі прадукцыі (майкі, кружкі, ручкі, значкі) з універсітэцкай сімволікай. Студэнты, якія будуць гэтым займацца, набудуць вопыт распрацоўкі бізнэс-плана, падмацуюць на практыцы веды, атрыманыя на курсе эканомікі. Яны будуць атрымліваць за гэта зарплату. Таму гэта яшчэ і дадатковае працаўладкаванне. Прыбытак будзе паступаць у арганізацыю, якая з цягам часу можа выйсці на самазабеспячэнне. Акрамя таго, БРСМ займаецца пошукам жылля для студэнтаў. На мой погляд, можна крыху пашырыць гэту дзейнасць. За сімвалічную плату студэнты, якія цікавяцца нерухомасцю, могуць шукаць жыллё для іншых. Прычым на ўсе паслугі член БРСМ будзе атрымліваць, напрыклад, дваццаціпрацэнтную скідку.



***Здаровая канкурэнцыя ў сценах БРСМ БДУ не перашкода сяброўству. Выбары сакратара праходзілі ў два туры. У другі тур выйшлі Юлія Крук і Дзмітрый Мікулка. Дзіма перамог з адрывам у 40 галасоў. Але месца сакратара не самае галоўнае, галоўнае — імкненне актывістаў зрабіць арганізацыю лепшай, унесці ў яе дзейнасць больш крэатыву.***

Зараз Дзіму засталося абараніць дыпломную работу. Пра размеркаванне думаць ужо не патрэбна. Малады спецыяліст-географ будзе працаваць у сценах роднага ўніверсітэта.

### НАКОЛЬКІ ЎДАЛАЯ ТАКАЯ ФОРМА РОЛЕВАЙ ГУЛЬНІ, ЯК ПРАВЯДЗЕННЕ ВЫБАРАЎ КІРАЎНІКА МАЛАДЗЁЖНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ?

***Міхаіл РАДЗЬКО, намеснік сакратара пярвічнай арганізацыі з правамі раённага камітэта ГА «БРСМ» БДУ, намеснік старшыні ўпраўлення выхаваўчай работы з моладдзю БДУ:***

— За аснову эксперыментальных выбараў новага сакратара арганізацыі ўзялі прыклад прэзідэнцкіх выбараў: галасаванне праходзіла тайна. Самі студэнты ўваходзілі, па адным прэтэндэнце ад штаба, у выбарчую камісію, самі лічылі галасы, сачылі за парадкам. Больш альтэрнатыўных выбараў у нас яшчэ ні разу не было. Дзіма Мікулка самы дэмакратычна выбраны сакратар у рэспубліцы.

Ролевая гульня «Твой выбар» выклікала ажыятаж не толькі сярод нашых студэнтаў. Ідэя правядзення альтэрнатыўных выбараў стала прычынай гарачай дыскусіі ў сценах Цэнтральнага камітэта ГА «БРСМ». Такую форму прэзентацыі сябе студэнтамі плануем укараняць на выбарах у органы студэнцкага самакіравання ўсіх узроўняў.

***Юлія КРУК, адна з кандыдатаў на пасаду сакратара БРСМ БДУ, сакратар пярвічнай арганізацыі БРСМ факультэта міжнародных адносінаў БДУ:***

— Вельмі ўдалая форма, на мой погляд. У кожнага кандыдата была магчымасць выказаць сваё меркаванне, магчымасць быць пачутым. Акрамя таго, гульня так захапляе, што забываешся на ўсё астатняе. Яна правярае каманду на трываласць, яднае яе. Такую методыку, несумненна, трэба рэалізоўваць ва ўсіх маладзёжных арганізацыях. Тады на выбары нікога не трэба будзе заганяць з-пад палкі. Галоўнае, зацікавіць моладзь. Мы, напрыклад, плануем падобным чынам правесці чарговыя выбары сакратара факультэта: пайсці ў двухдзённы паход за горад. Што тычыцца Дзімы, то ён атрымаў большасць галасоў заслужана. Ведаю яго не першы год. Дзіма адказны і працаздольны (рыхтаваліся мы да ролевай гульні ў кароткія тэрміны). Акрамя таго, ён камунікабельны і знаходлівы. Паверце, не кожны зможа дабіцца патрэбнай адказнай рэакцыі ад суразмоўцы на «круглым стале», правільна будаваць адказы на пытанні, зададзеныя на прэс-канферэнцыі, таксама мастацтва. Наша каманда выступіла на ўзроўні, мы вельмі стараліся. Напэўна, для перамогі не хапіла вопыту: я вучуся на трэцім курсе, а Дзіма на пятым. Але самае галоўнае — нас прыкмецілі. І калі-небудзь, магчыма, і мы прыйдзем на змену Дзіму.

**Надзея ДРЫЛА,**
**фота аўтара.**

Табе, абітурыент

# НАСУСТРАЧ ВЫПУСКНЫМ ЭКЗАМЕНАМ

**Як паведамілі нам у Міністэрстве адукацыі, экзамены для выпускнікоў базавай і сярэдняй агульнаадукацыйнай школ пройдуць сёлета з 26 мая па 6 чэрвеня. А навучальны год завершыцца для ўсіх школьнікаў 24 мая. Усяго выпускнікі базавай школы здаюць чатыры абавязковыя іспыты: беларускую мову (дыктоўку), рускую мову (дыктоўку), матэматыку (пісьмовы экзамен) і гісторыю Беларусі (вусны экзамен). Для выпускнікоў агульнаадукацыйнай школы прадугледжаны толькі тры выпускныя іспыты. Абавязковым з'яўляецца экзамен па адной з дзвюх дзяржаўных моў (беларускай ці рускай), які праводзіцца ў форме пераказу, і пісьмовы экзамен па матэматыцы. Трэці экзамен на выбар выпускніка праводзіцца, як правіла, у вуснай форме.**

Сярод выпускных экзаменаў на выбар могуць быць пісьмовы пераказ па рускай мове для тых, хто здаваў рускую мову, пісьмовы пераказ па беларускай мове для тых, хто здаваў беларускую мову, экзамен па мове нацыянальных меншасцяў (дыктоўка), беларускай і рускай літаратуры (вусны), замежнай мове (вусны), другой замежнай мове (вусны), гісторыі Беларусі (вусны ці абарона рэферата), Сусветнай гісторыі (вусна або абарона рэферата), геаграфіі (вусна), біялогіі (вусна), хіміі (вусна), фізіцы (вусна), астраноміі (вусна), інфарматыцы (вусна), Сусветнай мастацкай культуры (вусна або абарона рэферата), фізічнай культуры (у вуснай і практычнай формах), курсу «Чалавек. Грамадства. Дзяржава» (вусна), а таксама па курсе прафесійнай падрыхтоўкі.

Пры гэтым выпускнікі класаў з вывучэннем дысцыплін на павышаным і паглыбленым узроўнях трэці экзамен здаюць у якасці абавязковага па адным з профільных прадметаў (за выключэннем выпадкаў супадзення абавязковых экзаменаў і профільных прадметаў). Напрыклад, у класах фізіка-матэматычнага профілю матэматыка з'яўляецца абавязковым для здачы прадметам, таму навучэнцы могуць адзін прадмет здаваць на ўласны выбар, а ў класах хіміка-біялагічнага профілю навучэнцам неабходна выбраць для здачы трэцяга экзамену адзін з профільных прадметаў: хімію ці біялогію. Выпускнікі, якія вывучалі беларускую (рускую) мову на базавым і павышаным узроўнях, пішуць пераказ па розных тэкстах, а тыя, хто вывучаў мову на паглыбленым узроўні, пішуць водгук на літаратурны твор. Экзаменацыйную работу па матэматыцы навучэнцы таксама выконваюць па розных заданнях, у залежнасці ад узроўню вывучэння прадмета.

Як патлумачылі ў міністэрстве, экзаменацыйны расклад складаўся з улікам адзіных для ўсёй краіны тэрмінаў правядзення пісьмовых выпускных іспытаў. Усе тэксты і заданні для пісьмовых работ, як і ў папярэднія гады, будуць абвяшчацца па радыё і тэлебачанні.

**Выпускнікі базавай школы здаюць:**

**26 мая** — экзамен па матэматыцы ў класах, дзе гэта дысцыпліна вывучалася на базавым і паглыбленых узроўнях.

**28 мая** — дыктоўку па беларускай мове ў класах з вывучэннем беларускай мовы на базавым, павышаным і паглыбленым узроўнях.

**28 мая** — дыктоўку па рускай мове ў класах з вывучэннем рускай мовы на базавым і павышаным узроўнях.

**3 чэрвеня** — дыктоўку па беларускай мове ў класах з вывучэннем беларускай мовы на базавым і павышаным узроўнях.

**3 чэрвеня** — дыктоўку па рускай мове ў класах з вывучэннем рускай мовы на базавым, павышаным і паглыбленым ўзроўнях.

**5 чэрвеня** — матэматыку ў класах з вывучэннем матэматыкі на базавым і павышаным узроўнях.

Дату для здачы экзамену па гісторыі Беларусі навучальныя ўстановы вызначаюць самастойна.

**Выпускнікі XI (XII) класаў здаюць:**

**27 мая** — пераказ па беларускай мове ў класах з вывучэннем беларускай мовы на базавым і павышаным узроўнях і водгук на літаратурны твор у класах з вывучэннем беларускай мовы на паглыбленым узроўні.

**27 мая** — пераказ па рускай мове ў класах з вывучэннем рускай мовы на базавым і павышаным узроўнях.

**29 мая** — матэматыку ў класах з вывучэннем матэматыкі на базавым (у тым ліку і ў класах гуманітарнага профілю) і паглыбленым узроўнях.

**2 чэрвеня** — пераказ па беларускай мове ў класах з вывучэннем беларускай мовы на базавым і павышаным узроўнях.

**2 чэрвеня** — пераказ па рускай мове ў класах з вывучэннем рускай мовы на базавым і павышаным узроўнях і водгук на літаратурны твор у класах з вывучэннем рускай мовы на паглыбленым узроўні.

**4 чэрвеня** — матэматыку у класах з вывучэннем матэматыкі на базавым і павышаным узроўнях.

Дату трэцяга экзамену школа вызначае самастойна.

Паўторныя пісьмовыя экзамены для выпускнікоў базавай школы будуць праводзіцца 21 жніўня — па беларускай мове, 23 жніўня — па рускай мове і 25 жніўня — па матэматыцы.

Выпускнікі XI (XII) класаў будуць здаваць паўторны экзамен па матэматыцы 21 жніўня і 23 жніўня — па беларускай ці рускай мове.

У класах з вывучэннем вучэбных прадметаў мастацка-эстэтычнай накіраванасці выпускныя экзамены па спецыяльных вучэбных прадметах могуць праводзіцца ў форме канцэрта, выканання ці абароны практычнай работы, а таксама ў форме спектакля. Экзамены па спецыяльных прадметах (не больш як два) праводзяцца ў перыяд з 19 па 23 мая.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# ВЫТВОРЧАСЦЬ — НА СУСВЕТНЫМ УЗРОЎНІ

## Смачная, натуральная, карысная прадукцыя ААТ «ВалЖан» заўсёды ў радасць



На канвееры соус «Татарскі». За тэхналагічным працэсам сочыць інжынер Андрэй КАНАПУХІН.



— Якасць нашай прадукцыі заўжды гарантавана, — зазначыла лабарант-хімік Алена БУЯН.

**За непрацяглы час асобныя прыватнікі дасягаюць сапраўдных вяршынь у сваёй справе. У гэтым, прынамсі, пераконвае вопыт аднаго з прадпрыемстваў, якое было створана ў гарадскім пасёлку Гарадзея, што на Нясвіжчыне. Адкрытае акцыянернае таварыства «ВалЖан» спачатку было арганізавана як фермерская гаспадарка з такой жа назвай. Адбылося гэта ў 2003 годзе. Менавіта тады пачаў рэалізоўвацца цікавы, перспектыўны праект па стварэнні перапрацоўчай вытворчасці, якая не саступала б лепшым сусветным аналагам.**







— Быў напрацаваны неабходны вопыт у гэтай сферы, — узгадвае кіраўнік адкрытага акцыянернага таварыства «ВалЖан» Жана Русак. — Ідэя, зразумела, не з'явілася на пустым месцы — калі пачалі займацца гэтай справай, то дакладна ведалі, што рабіць. На працягу двух гадоў знаёміліся з адпаведнай вытворчасцю за мяжой — аб'ехалі шэраг еўрапейскіх краін. Вельмі карысна было ўбачыць тэхналогію і арганізацыю вытворчасці на прыкладзе лепшых прадпрыемстваў.

Пачынаць даводзілася ў прамым сэнсе слова з чыстага ліста. Перапрацоўка патрабуе дакладнасці і жорсткай тэхналогіі. Таму на працягу даволі доўгага часу падбіралася патрэбнае абсталяванне. У рэшце рэшт спыніліся на прапанове італьянскай фірмы «Boema». Вытворчыя магутнасці вырашана было ствараць на плошчах адкрытага акцыянернага таварыства «Гарадзейскі цукровы камбінат». Першую прадукцыю выпусцілі ў снежні 2005 года. У адкрытае акцыянернае таварыства з доляй удзелу Гарадзейскага цукровага камбіната фермерская гаспадарка «ВалЖан» была рэарганізавана ў чэрвені 2007 года.

Падчас наведвання прадпрыемства засталіся пад прыемным уражаннем ад яго тэхнічнай аснашчанасці. Увогуле, з чатырох адзінак абсталявання, якое імпартавалася адпаведнымі беларускімі прадпрыемствамі, толькі тое, што ўстаноўлена на «ВалЖане», дазваляе стэрылізаваць і фасаваць у стэрыльных умовах высакавязкі прадукт кавалачкамі да 1 сантыметра. Таксама ў лініі прыменены пастэрызатар бесперапыннага дзеяння, які дазваляе праводзіць беражлівую тэрмічную апрацоўку прадукцыі.

— Якасць у нас на высокім узроўні — вытворчасць сертыфікавана ў міжнароднай сістэме ISO 9001, — заўважае Жана Русак. — Гэтае патрабаванне на прадпрыемстве жорстка адсочваюць, паколькі якасць — адна з найважнейшых умоў асваення рынку.

У выніку прымянення высокатэхналагічнага абсталявання на «ВалЖане» падчас працэсу вытворчасці максімальна захоўваецца форма, натуральны водар, колер і смак ягад і садавіны. Выкарыстанне найноўшых тэхналогій дазваляе захоўваць у прадукцыі вітаміны і пажыўныя рэчывы. Зразумела, што ў такім разе прапанова ад «ВалЖана» карыстаецца ўстойлівым попытам. Смачная і карысная, натуральная прадукцыя кожнаму спажыўцу заўсёды ў радасць.

На прадпрыемстве асвоены выпуск больш чым паўсотні плодаагародніннных кансерваў. Сярод гэтай смакаты — павідла, падварка, садавіна-ягадныя напаўняльнікі, таматныя соусы, пюрэ, канфіцюры. Аб'ёмы вытворчасці стабільна павялічваюцца — за мінулы год было выпушчана больш чым 6,4 тысячы тон прадукцыі. У асноўным яна адгружаецца на Расію, прычым геаграфія паставак даволі шырокая — Масква, Санкт-Пецярбург, Кастрама, Мурманск, Сахалін, Уладзівасток. Адкрытае акцыянернае таварыства «ВалЖан» адкрыла шэраг гандлёвых прадстаўніцтваў у розных расійскіх рэгіёнах.

Расійскія партнёры ў поўнай меры ацанілі ўсе перавагі такога ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва. Пацвярджэннем менавіта высокай якасці прадукцыі — шматлікія ўзнагароды розных конкурсаў, у тым ліку і шэрагу міжнародных. Сярод апошніх заслужаных дасягненняў — тры залатыя медалі і ордэн за якасць, а таксама перамога ў намінацыі «Лепшы прадукт года-2008». Гэта прэстыж і прызнанне сучаснага ўзроўню вытворчасці на ААТ «ВалЖан». Прадукцыяй прадпрыемства зацікавіліся прадстаўнікі шэрагу замежных дзяржаў, у тым ліку нават ЗША і Японіі! Праз пэўны час плануюць выйсці і на Еўропу, а таксама развіваць пастаўкі на ўнутраным рынку. І ўсё гэта за два гады працы на вытворчасці.

Цяпер на прадпрыемстве працуюць 89 чалавек — гэта новыя працоўныя месцы. Калектыў малады і ініцыятыўны. Тут працуюць жыхары Гарадзеі, а таксама Нясвіжа, Баранавічаў, Стоўбцаў. Стабільна павялічваецца і ўзровень аплаты працы, паколькі растуць аб'ёмы вытворчасці, то «падцягваюць» і заробкі. Дарэчы, атрымліваюць работнікі нядрэнна — далёка не ўсюды ў вялікім горадзе такое прэстыжнае месца знойдзеш.

Сярод асноўных відаў дзейнасці ААТ «ВалЖан» — нарыхтоўка пладова-ягаднай прадукцыі, яе перапрацоўка, збыт, дастаўка, развіццё ўласнай таваратправоднай сеткі, а таксама вырошчванне патрэбнай прадукцыі. Прадпрыемства мэтанакіравана стварае ўласную сыравінную зону: у мінулым годзе заклалі 50 гектараў саду і зрабілі гадавальнік, а сёлета плануюць пасадзіць яшчэ 50 га. Новы вялікі сад, які з'явіцца непадалёк ад Гарадзеі, быццам сімвал. Сімвал жыцця і карпатлівай працы, адказных, душэўных адносінаў да сваёй справы. Менавіта так усё прывыклі рабіць на «ВалЖане».

**Мікалай ЛІТВІНАЎ.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

УНП 290327580



ЗАПРАШАЕМ ДА СУПРАЦОЎНІЦТВА
АДКРЫТАЕ АКЦЫЯНЕРНАЕ ТАВАРЫСТВА «ВалЖан»
МІНСКАЯ ВОБЛАСЦЬ, НЯСВІЖСКІ РАЁН,
г.п. ГАРАДЗЕЯ, вул. ЗАВОДСКАЯ, 2.
ТЭЛ./ФАКС: (01770) 58 8 38, 58 8 33
E-MAIL VALJAN@VALJAN. BY

# КАВАЛАК ЗЯМЛІ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Пісьмо прыведзена амаль цалкам і блізка да тэксту. Напісана яно на добрай беларускай мове. Пасля першага прачытання закралася думка, што аўтар яго, можа, былы настаўнік. Аказалася, не. Андрэй Пiліпавіч просты вясковы чалавек. Несумненна, працаўнік. Праўда, у калгасе ён ніколі не працаваў. Прыстройваўся ў розных іншых арганізацыях, відаць, каб больш часу заставалася дагледзець сваю зямлю. І цяпер у без малога 70-гадовага гаспадара ёсць вакол дома ўчастак зямлі плошчай у гектар. А гэты злашчасны кавалак, з-за якога разгарэліся страсці і пасыпаліся скаргі ва ўсе інстанцыі, памерам у 35 сотак цягнецца чорнай палоскай уздоўж рэчкі Струга. Ад яго А. Цябук адмовіўся, ёсць адпаведная заява ў сельсавеце, датаваная 8 кастрычніка 2007 года.

Вельмі шкада, што з аўтарам пісьма мы размінуліся. Хатняга тэлефона ў яго няма, таму папярэдзіць аб камандзіроўцы не ўдалося. І ў той дзень, як я прыехала ў Пяшкова, Андрэй Піліпавіч быў у лесе, нарыхтоўваў дровы. Так што гаварыць давялося толькі на наступны дзень па тэлефоне, а сутнасць справы вывучаць найбольш па дакументах. А дакументаў хапае, гаспадар з Пяшкова быў на прыёме і ў кіраўніка спраў, і ў старшыні райвыканкама, ёсць багатая перапіска з ім у землеўпарадкавальнай і падатковай службаў.

### ЗАКОНЫ І ПРАВІЛЫ

Нават з пісьма вынікае, якім чынам была набыта зямля ў карыстанне: шляхам вуснай дамоўленасці, якую, як вядома, да справы не прыкладзеш. Ды яшчэ і размешчаны той кавалак на беразе рэчкі, што з'яўляецца парушэннем рэжыму ўтрымання водаахоўнай зоны і прыбярэжнай паласы згодна з Пастановай Савета Міністраў ад 21 сакавіка 2006 года № 377. Але ж раней гэта была звычайная практыка. Сказаў старшыня калгаса, значыць, можна. І на прыбярэжныя зоны ніхто асабліва не зважаў. Падумаеш, раскарчаваў чалавек пару дзесяткаў метраў уздоўж берага. А вось па закону прыбярэжны хмызняк нават чапаць нельга, бо ён уваходзіць у агульную экасістэму ракі.

Мы гутарым з начальнікам землеўпарадкавальнай і геадэзічнай службы Іванаўскага раёна Анатолем Ксёндай. І Анатоль Пятровіч згаджаецца, што не заўсёды віна, але найбольш няведанне прыводзіць людзей у заканадаўчую пастку. У каго з вяскоўцаў, асабліва з тых, што жывуць на ўскраінах, няма лапіка зямлі, які яны прыхапілі для апрацоўкі паблізу сваіх агародаў? І нікога такі факт раней не здзіўляў, нават не цікавіў, асабліва калі зямля «нічыйная» і ніколі не апрацоўвалася. А цяпер ёсць патрабаванне ўсё ўзаконіць і прывесці хоць бы да элементарнага парадку. Апошняе даецца вельмі цяжка, бо вырасла некалькі пакаленняў на старой савецкай традыцыі. Людзі сталага веку ўспамінаюць, як сельсавет выдзяляў участкі для будаўніцтва 50—40 гадоў таму. Прыходзіў кіраўнік сельскай улады да месца будучай сядзібы, зірнуўшы ў паперы, а то і проста пачасаўшы патыліцу, ставіў бот на зямлю са словамі: «Будуй Іван альбо Сцяпан хату тут». Таму, як правіла, няма ў старэйшых жыхароў вёсак ні тэхпашпартаў, ні планаў землеўладанняў — ніякіх дакументаў ні на хату, ні на прысядзібны ўчастак. Вось і ўзнікаюць цяжбы за межы, паводле слоў Анатоля Ксёнды, якія аж да Вярхоўнага Суда даходзяць. Такія працэсы бясконцыя, бо даказаць, чые ж тыя пяць, дзесяць або пяцьдзесят сантыметраў мяжы немагчыма, калі няма адпаведнага дакумента. І пераадолець канфлікт можна толькі калі суседзі дасягнуць нейкай згоды і правядуць лінію на паперы, якая стане граніцай межаў.

Цалкам зразумела, чаму наш герой не хоча мірыцца з фармулёўкай «самавольны захоп зямлі», хоць фармальна так яно і ёсць. Начальнік раённай інспекцыі па падатках і зборах Уладзімір Казак расказаў пра падатковую эпапею з кавалкам зямлі ў Пяшкове. У кастрычніку мінулага года Андрэю Цебуку было прапанавана заплаціць падатак у памеры 244 тысяч рублёў, але плаціць ён адмовіўся. Тады падатковыя інспектары вырашылі спагнаць плацеж у пяціразовым памеры, як прадугледжана артыкулам 10 Закона «Аб плацяжах за зямлю». Сума налічэння склала 1 171 520 рублёў, як і ўказана ў пісьме. Потым, пасля зваротаў вяскоўца да старшыні райвыканкама, пісьмаў у розныя інстанцыі, памер падатку быў зноў перагледжаны. Налічаны без пяціразовага павелічэння, на гэты раз ён склаў 292 тысячы рублёў. Варта адзначыць, што ў падатковых дакументах фігуруе дата пачатку выкарыстання зямельнага ўчастка — 1 мая 2007 года, гэта значыць, з «моманту ўстанаўлення факта самавольнага захопу». Калі ж зыходзіць з тэрміну 10 гадоў, як прызнае аўтар пісьма, то сумы плацяжоў для вясковага чалавека былі б астранамічнымі.

### СЯЛЯНСКАЯ ЛОГІКА

У тэлефоннай размове з карэспандэнтам газеты Андрэй Цябук сказаў, што і гэтую суму плаціць не збіраецца. У яго свае аргументы. І галоўны з іх, што вакол многа пустой закінутай зямлі, якую ніхто не апрацоўвае, а да яго чамусьці чапляюцца. І сапраўды, сумная карціна ад напаўразваленых будынкаў былых жывёлагадоўчых памяшканняў літаральна за нейкі кіламетр ад сядзібы Цябука. Андрэй Піліпавіч расказаў, чаму адмовіўся ад паўтарагектарнага надзелу сенакосу, які раней арандаваў. З нічыйнай зямлі так палезла пустазелле на тую траву, што не змог даць рады. Ясна, што мясцовая гаспадарка не квітнее. Але ж апошняе не вызваляе грамадзяніна ад выканання законаў і правілаў. А з імі ў пяшкоўскага селяніна ёсць праблемы. Нават той гектар зямлі, які лічыцца за гаспадаром у ваколіцах дома, належным чынам не афармлены. На дакументах, якія знаходзяцца ў сельскім Савеце, пазначана: «Гэты план з'яўляецца часовым і падлягае замене». Замяніць яго належыць у землеўпарадкавальнай службе і зрабіць новы, так бы мовіць, легітымны дакумент.

Няма ніякага сумнення ў тым, што Андрэй Цябук — вялікі працаўнік. Апрацоўвае зямлю, трымае вялікую гаспадарку, мае свой трактар, як ён сам сказаў, корміць сем чалавек. Разам з гаспадаром жывуць дачка, зяць, двое ўнукаў, яшчэ адна дачка і жонка. Жонка Таццяна Сцяпанаўна працуе ў вясковай краме, адзінай грамадскай установе Пяшкова. Пра яе работу землякі выказваліся толькі з пашанай. Працавітая сям'я. Галава яе ўсё жыццё трымаўся за свой кавалак зямлі, але прывык мысліць і рабіць па-старому, і не ўсвядоміў, што парадак змяніўся. Любая гаспадарчая дзейнасць на зямлі нават з самымі добрымі намерамі патрабуе дакументальнага афармлення і выканання ўсіх фармальнасцяў.

У Пінску давялося гутарыць з пенсіянеркай, у якой на праве сямейнай рэліквіі захоўваецца план прысядзібнага ўчастка з зямельным надзелам, выдадзены мясцовым органам улады яе бацьку яшчэ за польскім часам. Там усё старанна расчэрчана, пазначаны ўсе адлегласці. Нешта накшталт гэтага стараюцца ўкараніць нашы адпаведныя службы цяпер у процівагу калгасна-саўгаснай псіхалагічнай устаноўцы «ўсё вакол калгаснае — усё вакол маё», якая доўжылася дзесяцігоддзямі. І працэс ідзе даволі хваравіта. Як заўважыла старшыня Іванаўскага райсавета дэпутатаў Святлана Майсейчык: («Людзі гадамі прывыкалі да адносна вольнага землекарыстання, і прывесці іх у рамкі закона адным махам без якога-небудзь пераходнага перыяду вельмі складана». Але пераходны перыяд законам не прадугледжаны, а закону ўсё роўна трэба падпарадкоўвацца).

***

І яшчэ адзін штрых замест канцоўкі. Увесь час, пакуль давялося вывучаць дакументы, недзе ўнутры жыло шкадаванне да вясковага чалавека, што вось так з ім атрымалася. Але яно змянілася здзіўленнем, як толькі трапіла на сядзібу гаспадара. Мякка кажучы, здзіўленнем. Вакол хаты і надворных пабудоў утворана такая звалка з металалому, будаўнічых адходаў і яшчэ невядома якога смецця, што цяжка сказаць, колькі рэйсаў трэба зрабіць трактарам або грузавіком, каб усё гэта вывезці. Хата героя нашага матэрыялу стаіць паміж вёскамі, вакол — шырокія прасторы. Пры іншым раскладзе тут можна было б абсталёўваць аграсядзібу і прымаць гасцей. Але пейзаж ваколіц двара такі, што я проста пасаромелася даць у газету. Здымкі засталіся ў маім архіве, як і надзея на тое, што гаспадар з надыходам вясны зробіць які-кольвечы парадак.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*Іванаўскі раён.*

МТБанк
МИНСКИЙ ТРАНЗИТНЫЙ БАНК

# ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «ОЛИМПИЙСКАЯ КАРТА»

**1.1**. Настоящие Правила разработаны в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 30.01.2003 г. № 51 «О проведении рекламных игр в Республике Беларусь» и Инструкцией о порядке государственной регистрации рекламных игр, утвержденной постановлением Министерства торговли Республики Беларусь от 26.03.2003 г. № 11.

**1.2.** Рекламная игра «Олимпийская карта» проводится на территории Республики Беларусь.

**2. Наименование организатора рекламной игры.**

**2.1**. Организатором рекламной игры выступает Закрытое акционерное общество «Минский транзитный банк», зарегистрировано Национальным банком Республики Беларусь 14 марта 1994 года. (Письмо о регистрации банка № 03009/119 от 15.03.1994 г.)

УНП 100394906.

Место нахождения организатора: г. Минск, Партизанский пр., 6а.

**3. Наименование рекламной игры, место (территория), и сроки ее проведения:**

**3.1**. *Наименование:* рекламная игра «Олимпийская карта».

**3.2.** *Место (территория) проведения:* Республика Беларусь.

**3.3**. *Сроки проведения рекламной игры:* Рекламная игра проводится с 01.04.2008 г. по 30.05.2008 г.

**4. Описание рекламной игры, порядок розыгрыша призового фонда и порядок определения победителя:**

*Порядок проведения рекламной игры:* по следующим датам 1—4 апреля, 7—11 апреля, 14—18 апреля, 21—25 апреля, 28—30 апреля, 5—7 мая, 12—16 мая, 19—23 мая, 26—30 мая 2008 года (всего 40 дней) в период с 08.00 до 20.00 в эфире «Радио Би-Эй» звучит музыкальная заставка рекламной игры «Олимпийская карта». Слушатели «Радио Би-Эй», желающие принять участие в рекламной игре, дозваниваются в эфирную студию по телефону (+375 17) 290 26 00. Первый, дозвонившийся в эфир совершеннолетний слушатель, становится обладателем пластиковой карты MasterCard Standard ЗАО «Минский транзитный банк» сроком действия 1 (один) год с оплаченным сервисным обслуживанием в соответствии с перечнем призов и выигрыша в размере 20 000 (двадцать тысяч) белорусских рублей. Слушатель может принять участие в игре только один раз.

Ведущий Радио Би-Эй предлагает участнику игры ответить на два вопроса. Первый вопрос связан с олимпийскими играми. При правильном ответе на первый вопрос сумма выигрыша увеличивается до 50 000 (Пятидесяти тысяч) белорусских рублей. Второй вопрос связан с услугами ЗАО «Минский Транзитный Банк». При правильном ответе на второй вопрос сумма выигрыша увеличивается до 100 000 (Ста тысяч) белорусских рублей.

В случае если участник игры правильно ответил только на один вопрос, или не дал ни одного правильного ответа, не разыгранная денежная сумма («Джек-пот») переходит на следующую игру.

В следующей игре, в розыгрыше «Джек-пота» может участвовать победитель игры, который правильно ответил на первые два вопроса викторины. Чтобы получить сумму «Джек-пота», участнику игры необходимо правильно ответить на третий вопрос. Третий вопрос викторины связан с олимпийскими играми. В случае если участник не отвечает на третий вопрос, сумма «Джек-пота» переходит на следующую игру. После окончания рекламной игры неразыгранная часть призового фонда остается в распоряжении банка.

На карт-счет победителю зачисляется сумма за вычетом подоходного налога.

Общее количество участников — 40 (сорок).

Разыгранные суммы, суммы «Джек-пота», а также данные об участниках игры (ФИО и контактный телефон) фиксируются в протоколах заседания комиссии.

**5.** Контроль за правильностью проведения рекламной игры и соответствия ее настоящим правилам возлагается на комиссию. Состав комиссии утверждается организатором рекламной игры. Результаты проведения игры комиссия удостоверяет посредством составления протокола, подписанного всеми присутствующими на заседании членами комиссии.

Комиссия по проведению рекламной игры осуществляет свою деятельность в соответствии с зарегистрированными в установленном порядке правилами данной игры. Заседания комиссии по проведению рекламной игры правомочны при наличии большинства членов зарегистрированного ее состава. Решения этой комиссии оформляются протоколом, который должен быть подписан всеми присутствующими на заседании членами комиссии.

**6. Источники формирования призового фонда, его структура:**

Призовой фонд формируется за счет чистой прибыли ЗАО «Минский транзитный банк». Общая стоимость призового фонда: 5 800 000 (Пять миллионов восемьсот тысяч) белорусских рублей.

| Наименование приза | Количество (штук) | Стоимость сервисного обслуживания в течение года за единицу (бел. руб.) | Общая стоимость (бел. руб.) |
|---|---|---|---|
| Пластиковая карта «MasterCard Standard» сроком действия 1 (один) год | 40 | 45 000 | 1 800 000 |
| ИТОГО: | 40 | | 1 800 000 |

| Наименование приза | (бел. руб.) | Количество | Стоимость (бел. руб.) |
|---|---|---|---|
| Денежный приз каждому участнику игры | 20 000 | 40 | 800 000 |
| Денежный приз за ответ на первый вопрос | 30 000 | 40 | 1 200 000 |
| Денежный приз за ответ на второй вопрос | 50 000 | 40 | 2 000 000 |
| ИТОГО: | | | 4 000 000 |

Призовой фонд формируется за счет чистой прибыли ЗАО «Минский Транзитный Банк» до начала проведения игры. Общая стоимость призового фонда составляет 5 800 000 (Пять миллионов восемьсот тысяч) белорусских рублей.

**7. Порядок розыгрыша призового фонда:**

Призовой фонд рекламной игры «Олимпийская карта» разыгрывается в прямом эфире «Радио Би-Эй» по адресу: г. Минск, ул. Сурганова, 26, к. 211. Каждый будний день с 01 апреля по 30 мая 2008 года в период с 08.00 до 20.00.

**8. Порядок, сроки и место получения призов**

Победитель игры, имеющий право на получение приза, должен заполнить заявление-анкету на получение пластиковой карточки установленного образца и предоставить ксерокопию паспорта (фамилия, имя, серия, номер, дата рождения) в ЗАО «Минский транзитный банк» по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, 6а, каб. 507 в течение 14 (четырнадцати) календарных дней с момента участия в рекламной игре в эфире «Радио Би-Эй». Неявка победителя в указанный срок является отказом от выигрыша. Призы выдаются ЗАО «Минский транзитный банк» в течение пяти банковских дней с момента обращения победителя.

Вручение призов будет производиться при наличии паспорта или иного документа, удостоверяющего личность, в Головном офисе банка по адресу: 220030, г. Минск, Партизанский пр., 6а.

Участник, выигравший приз, должен письменно подтвердить факт его получения и заполнить все необходимые документы, предоставленные организатором и связанные с получением приза. С момента передачи приза участнику, последнему переходят все риски и обязательства, связанные с владением, пользованием и распоряжением имуществом. Ответственность по уплате налогов, предусмотренных действующим законодательством в связи с получением приза, лежит на победителях рекламной игры.

**9. Опубликование информации о рекламной игре**

Правила проведения рекламной игры, состав комиссии по проведению рекламной игры и размер призового фонда публикуются в печатных средствах массовой информации до начала рекламной игры. Результаты рекламной игры публикуются в печатных средствах массовой информации в период с 31 мая по 13 июня 2008 г.

**10. Телефон горячей линии рекламной игры**

Телефон для справок: **+375 17298 32 21**. Дополнительную информацию также можно получить по телефонам: +375 44 77 84777, +375 44 77 85777, +375 33 63 76777 с 09.00 до 18.00 по будним дням.

### Состав комиссии по проведению рекламной игры «Олимпийская карта»

**Председатель комиссии:** Карнаух Ольга Анатольевна, начальник управления неторговых операций ЗАО «Минский транзитный банк»
Срок полномочий с 01.04.2008 г. по 30.05.2008 г.

**Члены комиссии:**

1) Гирин Олег Владимирович, заместитель начальника управления неторговых операций ЗАО «Минский транзитный банк».
Срок полномочий с 01.04.2008 г. по 30.05.2008 г.

2) Хандогин Александр Николаевич, начальник КартЦентра ЗАО «Минский транзитный банк».
Срок полномочий с 01.04.2008 г. по 30.05.2008 г.

3) Степанов Денис Юрьевич, руководитель сектора программ СП «Би-Эй Интернэшнл»-ООО.
Срок полномочий с 01.04.2008 г. по 30.05.2008 г.

4) Волова Елена Григорьевна, администратор СП «Би-Эй Интернэшнл»-ООО.
Срок полномочий с 01.04.2008 г. по 30.05.2008 г.

*Свидетельство № 997 о государственной регистрации правил проведения рекламной игры от 25 марта 2008 года ЗАО «Минский транзитный банк». Лицензия НБРБ № 13 на осуществление банковской деятельности от 27.10.2006 г. УНН 100394906*

# ПЯТНІЦА, 4 КРАСАВІКА

**5.30. 15.40 Серыял «Прымадонна».**
**6.20, 7.10, 8.10** Добрай раніцы, Беларусь!
**6.30, 7.05** Прэс-агляд.
**6.45, 7.45, 19.30** Зона X.
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 16.00, 18.00, 19.00, 23.15** Навіны.
**7.30** Дзелавое жыццё.
**8.20** Гатуем разам.
**8.35** Сфера інтарэсаў.
**9.05. 19.50 Серыял «Апостал».**
**10.00 Серыял «Родныя людзі».**
**11.00, 17.45 Серыял «Сэрцу не загадаеш».**
**12.10 Камедыя «Залатое цяля».**
**15.55** Гадзіна суда. Справы сямейныя.
**14.50** Nota Bene.
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.30** ЕўраФэст.
**16.40** «Жыццё як жыццё».
**21.00** Панарама.
**21.45, 1.30 Серыял «Лічбы».**
**22.45** Фігуры.
**23.25** Дзень спорту.
**23.35 Трылер «Альфа Дог».**

*9.05—15.00 Тэхнічная прафілактыка ў Салігорску.*
**6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 0.10, 3.00** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05 «Таццянін дзень». Серыял.**
**10.00** «Модны прыгавор».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 0,25, 3.20** Навіны спорту.
**11.10 «Ціхі Дон». Серыял. Заключная серыя.**
**12.00** «Малахаў+».
**13.10 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».**
**14.10** «Гадзіла».
**14.30** «Кантрольная закупка».
**15.05 «Дачка садоўніка». Серыял.**
**16.15 «Агонь кахання». Серыял.**
**17.10** «Няхай гавораць» з Андрэем Малахавым.
**18.20** «Дакументальны дэтэктыў». «Забойства Акцёра».
**18.55** Поле цудаў.
**20.00** Час.
**21.05** «Цудоўная пяцёрка». Фінал.
**22.40** «Наша Belarussia».
**23.15** «Сярэбраны грамафон».
**0.30 Маст. фільм «Брыдкія лебедзі».**
**3.25 Класіка жахаў. «Дракула».**
**4.40** «Прытулак камедыянтаў».
**6.30** «Смеху дзеля».

**6.45, 14.00** Мультсерыял «Цімон і Пумба».
**7.10** Ранішняя падзарадка.
**8.10, 15.50** «Смачна з Барысам Бурдой».
**8.45 Серыял «Каралі гульні».**
**9.40** У гэты дзень.
**9.45, 16.30** Гадзіна суда з Паўлам Астахавым.
**10.40** «Тэатр. Выбранае...». Ваш выхад, юбіляр! Уладзімір Рагаўцоў.
**11.05, 17.30 Серыял «Жанчына з водарам кавы».**
**12.05** Дак. фільм «Цэнтр Пампіду — сімвал эпохі».
**13.00** ПРАсоўванне+.
**13.35** Анекдот. LAD.
**14.20** Мультфільм.
**14.45** Пазакласная гадзіна.
**14.55** Клуб былых жонак.
**18.35** Навіны культуры.
**18.50** Усё аб бяспецы.
**19.25** «Цудоўная сямёрка».
**20.10** Калыханка.
**20.25** «Страсць і ўлада». «Вытокі дынастый».
**21.10** «Прыстанак душы». Прападобны Афанасій, ігумен Брэсцкі.
**21.40** Хакей. НХЛ. Матч тыдня.
**23.25** Шок-О-ЛАД.
**0.25** Казанова.

**6.00. 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.20** «Міншчына».
**6.20, 7.40** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**8.30, 16.50 «Афрамасквіч». Серыял.**
**9.00 «Салдаты 14». Серыял.**
**10.00** «Новыя падарожжы дылетанта».
**10.40** «Аўтапанарама».
**11.00 «Рэбека». Серыял.**
**11.50, 18.25 «Танга ўтраіх». Серыял.**
**12.40** «Далёкія сваякі».
**13.00** «Асабісты інтарэс».
**13.50** «Відавочца прадстаўляе: самае шакіруючае».
**14.45** «Гаргуллі». Мультсерыял.
**15.10 «Элен і сябры». Серыял.**
**15.40** «Я — падарожнік».
**16.00** «Ёсць кантакт».
**17.30** «Званая вячэра».
**20.05** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, малы».
**20.30 Камедыя «Наша шалёнае жыццё».**
**22.55** «Відзьма-нявідзьма».
**23.35 Баявік «Рэтраград».**
**1.05** «Па поўнай праграме».

**5.00, 6.15, 7.00, 1.00** Садружнасць Life.
**5.30, 14.30 Серыял «ОБЖ».**
**6.00, 9.00, 12.00, 15.00, 21.00** «Навіны Садружнасці».
**6.45** Камерцыйная праграма.
**7.30** Даведнік.
**8.00 Серыял «Галоўныя ролі».**
**9.15** «Спрэчная тэрыторыя».
**10.15** «Арт-рэвалюцыя».
**10.30 Серыял «Дзікі месяц».**
**11.30** Дак. серыял «Вяселлі на мільён долараў».
**12.15** Студыя 60х90.
**12.25, 22.25 Маст. фільм «Я — следчы».**
**14.15** «Вучым англійскую».
**15.25, 0.15** Дак. серыял «Эліта грамадства».
**16.25. 1.30** «Чароўная планета Франца Харары».
**17.25, 2.30** «Простыя лічбы». «Паэт Ільля Рэзнік: 70 гадоў».
**18.00** Дзелавы тыдзень.
**18.25** «Без палітыкі».
**18.45** «Сустракаемся ў Беларусі».
**19.45** «Цік-так».
**20.00** «Слава за хвіліну».
**21.25** «Бушыдо — шлях воіна».

**7.00, 10.50, 12.30, 19.35** «Навіны кіно».
**7.10, 10.55, 23.35** «Метэапрагноз».
**7.15 Маст. фільм «Кактус».**
**9.00** «Дом жывых гісторый».
**9.30** «К-відэа» для дзяцей.
**9.50 Серыял «Брыгада».**
**11.00 Маст. фільм «Верная нявернасць».**
**12.40** «Дзённы тэлечат».
**16.30** Мультпарад.
**16.40 Серыял «Дзесятае каралеўства».**
**18.15, 23.30** «К-гульні».
**18.20 Серыял «Амазонія».**
**19.10** «Хіт-парад тэлечата».
**19.45, 21.20** «Распродаж. Навінкі. Акцыі».
**19.50 Серыял «Горац».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.05** «Зялёны дом».
**21.25** «Героі коміксаў на экране».

**7.00** Добрай раніцы, Расія!
**9.00** «Мой сярэбраны шар. Таццяна Лаўрова».
**9.50 Серыял «Казус Кукоцкага».**
**10.45** Весткі. Дзяжурная часць.
**11.00, 14.00, 17.00, 19.00** Весткі.
**11.25, 14.20, 19.25** Мясцовы час. Весткі—Масква.
**11.45 Серыял «Целаахоўнік».**
**12.35** «У Гарадку».
**12.55 Серыял «Чужыя тайны».**
**13.50, 16.50, 18.50, 23.00** Весткі—Беларусь.
**14.30 «Кулагін і партнёры».**
**15.00** Суд ідзе.
**15.55 Серыял «Рамэо і Джульета».**
**17.30** Мясцовы час. Весткі—Маскоўская вобласць.
**17.50 «Жанчына без мінулага». Серыял.**
**19.50** «Юрмала».
**20.50** Добрай ночы, малыя!
**21.00 Баявік «Заложнік!».**
**23.10 Баявік «Авалон».**

**7.00** «Добрай раніцы, Расія!»
**10.00, 17.25. 0.25 «Гонка за шчасцем». Серыял.**
**10.45. 18.15, 1.10 «Жанчына без мінулага». Серыял.**
**11.30** «Эпізоды». Данііл Співакоўскі.
**12.10 Серыял «Варажбітка».**
**13.00, 16.00, 19.00, 3.00** Весткі.
**13.20** Весткі—Масква.
**13.35 Маст. фільм «Карпацкае золата».**
**15.05** Мультфільм.
**15.15, 1.55** «Мой сярэбраны шар. Эліна Быстрыцкая».
**16.30** Весткі—Паўночны Каўказ.
**16.45** Весткі—спорт.
**16.55** «Пятае вымярэнне».
**19.45, 3.45** «Вялікі юбілейны канцэрт Уладзіміра Вінакура. «60 гадоў, а я не веру».
**22.50 Камедыя «Гульня на мільёны».**
**2.40** Навіны культуры.

**6.00** Сёння раніцай.
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**9.00 Серыял «Марскія д'яблы-2».**
**9.50, 15.25** «Асарці».
**10.20** «Перамогшыя смерць».
**10.50** «Авіятары».
**11.15 Серыял «Мангуст-2».**
**13.30 Серыял «Масква. Цэнтральная акруга».**
**15.35** «Агляд. Выратавальнікі».
**16.25 Серыял «Вяртанне Мухтара-2».**
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.45** «Следства вялі...».
**20.50** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**21.15 Баявік «Трынаццаты раён».**
**23.05 Драма «Звязаныя падманам».**

**5.00** Канал «Настрой».
**7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30** Падзеі.
**7.45, 10.15, 1.35** Пятроўка, 38.
**7.55, 13.45, 17.15, 18.50** «Гісторыя дзяржавы Расійскай».
**8.05 Маст. фільм «У мірныя дні».**
**10.00** «Рэпарцёр».
**10.45 «Справа была ў Гаўрылаўцы». Серыял.**
**11.40 «Сляпы-2». Серыял.**
**12.40** «Доказы віны». «Іх называлі «Брыгада».
**13.50** Небяспечная зона.
**14.30, 1.55 «Закон Вольфа». Серыял.**
**15.30** Новая «Часінка».
**16.55** Дзелавая Масква.
**17.20 «Развітальныя гастролі». Маст. фільм.**
**18.55** У цэнтры ўвагі.
**20.00 «Крымінальны квартэт». Маст. фільм.**
**21.50** «Народ хоча ведаць». Ток-шоў.
**22.55** Падзеі. 25-я гадзіна.
**23.25** Дак. фільм «У гэты дом я прывык прыходзіць...».
**0.00 Маст. фільм.**
**2.50 Маст. фільм.**
**4.35** Мультпарад.

**9.30, 15.15, 16.45, 19.30** Вось гэта дзіва!!!
**9.45** Аўтаспорт.
**10.15** «Алімпійскія гульні».
**10.45, 20.00** Снукер. Зала славы.
**11.45, 18.00. Тэніс.** Турнір WTA.
**14.00, 15.30, 17.00, 1.00** Футбол. Ліга чэмпіёнаў.
**19.00** Футбол. Еўрагалы.
**21.00** Самыя дужыя людзі планеты.
**22.00** Цімберспортс.
**23.00** Рэстлінг.
**0.30** Экстрэмальны спорт.

## 20.30 ФІЛЬМ ДНЯ

### «НАША ШАЛЁНАЕ ЖЫЦЦЁ» (ФРАНЦЫЯ, 2005 г.)

Луіза — гаспадыня кавярні, дзе яна працуе разам з маці. Аднак у хуткім часе насупраць іх сваё кафэ адкрывае фанабэрыстая Люсіль і яе працiўныя дочкі — іх вечныя канкурэнткі.



**Рэжысёр** Жэрар Краўчык. **У ролях:** Сільві Тэсцю, Мішэль Мюлер, Эрык Кантана.

# СУБОТА, 5 КРАСАВІКА

**6.30** Дак. серыял «Гісторыі Міжземнамор'я».
**6.55** Брытва Акама.
**7.25** Існасць.
**7.50** «Добрай раніцы, Беларусь!»
**9.00, 12.00, 15.00, 18.00** Навіны.
**9.05** Здароўе.
**9.40 Серыял «Давай пажэнімся».**
**10.15** Шпілька.
**10.50** Тайны смак.
**11.25** Ранішняя хваля.
**12.15 Камедыя «Дзелавыя людзі».**
**14.00** «Акадэмія жыцця».
**14.25** Мужчынскі характар.
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.35** Мужыкі.
**16.05** «Летапіс часоў».
**16.50** Вакол планеты.
**17.35** Зона X.
**18.20** «Ваша лато».
**19.20** Канцэрт, прысвечаны 90-годдзю ўнутраных войскаў МУС Рэспублікі Беларусь.
**21.00** Панарама.
**21.45 Баявік «Бой з ценем».**
**0.10** «Формула-1». Гран-пры Бахрэйна. Кваліфікацыя.
**1.25** Легенды сусветнага рока. «Yes. 35 гадоў».

**7.00** «Суботняя раніца».
**8.00, 9.00, 16.00, 20.30, 3.00** Нашы навіны.
**9.05 Серыял «Сябры».**
**9.40** «Здароўе».
**10.25** «Смак».
**11.00** «Вясна Інтэрнэшнл». Дак. фільм.
**11.30** Тэлечасопіс «Саюз».
**12.00 Меладрама «Матылёк».**
**13.40** «Наталля Кусцінская. Расплата за каханне».
**14.40 Камедыя «Спячы леў».**
**16.10, 21.00, 3.20** Навіны спорту.
**16.15 Баявік «Людзі ў чорным».**
**18.05** «У свеце людзей».
**19.10** «Адзін супраць усіх».
**20.00** Вялікая палітыка.
**21.05** «VI Нацыянальны конкурс прыгажосці «Міс Беларусь-2008. Віцебская вобласць».
**22.40** «Эліна Быстрыцкая. Сэрца прыгажуні».
**23.40** Што? Дзе? Калі?
**1.10 Меладрама «Блакітная лагуна».**
**3.25 Камедыя «ZE фільм».**
**5.05 Маст. фільм «Рускі сувенір».**

**7.45** Дак. серыял «Дзікае паляванне».
**8.15 Серыял «Філ з будучыні».**
**9.00** Свая кампанія.
**10.05** Урачэбныя тайны з доктарам А. Цярэшчанкам.
**10.40** Сезон у дачы.
**11.20** Школа рамонту.
**12.25** Добрыя навіны.
**13.05** «Касмапалітэн».
**14.00** «Тэатр. Выбранае...» Артыст Сяргей Чэкерас.
**14.40** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Арсенал—Ліверпуль.
**16.45 Камедыя «Банзай».**
**18.40** «Спорт, спорт, спорт...» Анжэла Кацюга.
**19.20 Драма «Дзіця».**
**21.15** Анекдот. LAD.
**21.35** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. Плей-оф. Фінал.
**23.25** Баскетбол. НБА. Сан-Антоніо—Юта.

**6.30** «Ваенная тайна».
**7.20** Анфас.
**7.35** «Прыгоды кенгуранят». Мультсерыял.
**8.00 Серыял «Трое зверху».**
**9.00** «Наш дом».
**9.25** «Вялікія мазгаломы».
**10.25** «Прачніся і спявай».
**11.00** «Мінск і мінчане».
**11.30 Серыял «Халасцякі».**
**12.35 Маст. фільм «І зноў Аніскін».**
**14.05** «Геркулес». Мультсерыял.
**14.30** «Новыя падарожжы дылетанта».
**15.00** «Народжаныя ў СССР».
**15.45** «Відзьма-нявідзьма».
**16.30, 19.30** «24 гадзіны».
**16.40** «Фантастычныя гісторыі».
**17.30** «Наша справа».
**17.40** «Прыватныя гісторыі».
**18.30** «Паспець усё».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10 Маст. фільм «Пік Дантэ».**
**21.55** «Нашы рэкорды».
**22.55 Маст. фільм «Сінобі».**
**0.40** «Бла-бла-шоў».
**1.50 Трылер «Акулы».**

**5.00, 12.15** Любімыя акцёры.
**5.10, 12.25 Казка «Раз, два — гора не бяда!»**
**7.00** Камерцыйная праграма.
**7.30** «Паэзія Арменіі».
**7.45** Мультсерыял «Прыгоды маленькай рыбкі».
**8.15** «У гасцях у Мінуткі».
**8.30 Серыял «Знакаміты Джэт Джэксан».**
**9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 21.00** Навіны Садружнасці.
**9.10** «Мар, дзейнічай, будзь!»
**9.40** «Ведаем рускую».
**10.40** «Вялікая будоўля».
**11.10** «Тайны забытых перамог». «Выпрабаванне невядомасцю».
**14.15** «Пагуляем па-піцерску».
**14.45** «Дзень пасла».
**15.25** Дак. серыял «Гэтыя цудоўныя жывёлы».
**16.25** «У нашу гавань заходзілі караблі...»
**17.25 Серыял «Фердынанд Цудоўны».**
**18.25, 1.40 Маст. фільм «Відок».**
**20.30, 1.10** «Супраць мафіі».
**21.25 Маст. фільм «Ігракі».**
**0.20 Серыял «Горац-3».**

**9.00, 15.50, 19.00** «Навіны кіно».
**9.05, 23.45** «Метэапрагноз».
**9.10** «Адзінка ў кубе».
**9.30, 14.40** Мультпарад.
**9.55, 16.30** «К-гульні».
**10.00** «Хіт-парад тэлечата».
**10.30** «Героі коміксаў на экране».
**12.30** «Майстры кіно». Олівер Стоун.
**16.00** «Адшукваецца адпачынак».
**17.15** Аўтарскі канцэрт Сяргея Наско.
**19.10, 21.00** «Распродаж. Навінкі. Акцыі».
**19.15 Маст. фільм «Таямнічы востраў». 1-я серыя.**
**20.45** «Вечарніца».
**21.05 Маст. фільм «Англійскі пацыент».**

**7.00** Добрай раніцы, Расія!
**8.05** «Ваенная праграма».
**8.30** Мультсерыял «Огі і прусакі».
**8.50** «Дыялогі пра жывёл».
**9.20** Ранішняя пошта.
**10.00** Сінеманія.
**10.30** Гарадок. Дайджэст.
**11.00, 14.00, 19.00** Весткі.
**11.10** Мясцовы час. Весткі—Масква.
**11.20** «Суботнік».
**12.00** «Звышнатуральнае: дзіўныя сілы жывёл». Дак. серыял.
**12.45** «Вакол свету».
**13.45** «Уся Расія».
**14.20** Мясцовы час. Весткі—Масква.
**14.30 Маст. фільм «Дом спатканняў».**
**16.15** «Ты — тое, што ты ясі».
**17.15** «50 бландзінак. Інтэлектуальнае шоў».
**18.30** «Рэвізор».
**19.20** «Суботні вечар».
**21.15 Маст. фільм «Мар-лен Дзітрых».**
**23.50** Гарачая дзесятка.

**7.00** «Добрай раніцы, Расія!»
**8.30 Маст. фільм «Доўгі дзень».**
**10.00, 13.00, 19.00, 3.00** Весткі.
**10.10** Весткі—Масква.
**10.20** «Біблейскі сюжэт».
**10.50, 1.20 Маст. фільм «Зімняя вішня». 1-я серыя.**
**11.45, 14.05** Мультфільмы.
**12.05** «Хто ў доме гаспадар».
**12.30** «Рознычытанні».
**13.15 Серыял «Свая каманда».**
**14.15** «За сямю пячацямі».
**14.50** «Вакол свету».
**15.35** «Камертон».
**16.05** «Нацыянальны інтарэс».
**16.50** «А вас, грамадзянін, не пытаюцца!..» Павел Нілін.
**17.35, 6.10** «Магія кіно».
**18.15, 2.15 Серыял «Тэрмінова ў нумар».**
**19.20, 3.20** «Гібель Імперыі. Візантыйскі ўрок».
**20.35, 4.35** «Суботні вечар».
**22.05** Да 85-годдзя тэатра ім. Масcавета. «Раніца. Дзень. Вечар».
**22.45** «Шырокі фармат».
**23.10 Маст. фільм «Зайздрасць багоў».**

